Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 113 (4017)
ПАНЯДЗЕЛАК, 27 КРАСАВІКА
1931 г.
Цана нумару 5 кап.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА

У дзень 10 гадовага юбілею большавіцкае прывітаньне „Чырвонай Зьмене"

«Зьвязда» шле большавіцкае прывітаньне баявому органу ЦК ЛКСМБ—«Чырвонай Зьмене» ў дзень 10 гадовага юбілею.

10 год «Чырвонай Зьмены»—10 слаўных старонак у гісторыі камсамолу Беларусі. Разам з ростам камсамолу расла і газэта. Ад «Краснога Факела», які заклікаў моладзь Беларусі на барацьбу з белапольскімі акупантамі, да «Чырвонай Зьмены»—баявой газэты, якая пад кіраўніцтвам ЦК ЛКСМ і ленінскай партыі змагаецца за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі, за сацыялістычную рэканструкцыю народнай гаспадаркі, за пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі.

Уступаючы ў 11 год свайго існаваньня, Чырвоная Зьмена» павінна яшчэ больш прасякнуць палітычным зьместам, кожны радок у газэце узмоцніць барацьбу з правым і «левым» ухілам ад генэральнай лініі, з прымірэнцтвам, з праявамі вяліпадзяржаўнага шавінізму, нацыянал-дэмакратызму і шавінізмамі іншых колераў. «Чырвоная Зьмена» павінна шырэй асьвятляць на сваіх старонках жыцьцё і барацьбу камсамолу капіталістычных краін, палепшыць работу па інтэрнацыянальным выхаваньні рабочай моладзі, палепшыць масавую работу сярод юнкораў, весьці ўпартую барацьбу за пасьляховае выкананьне пляну трацяга рашаючага году пяцігодкі, за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады.

«ЗЬВЯЗДА».

26-ы ДЗЕНЬ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ПРАВЕРКІ

У ПАЎДНЁВЫХ РАЁНАХ БССР
ПАЧАЛАСЯ МАСАВАЯ СЯЎБА

МТС І САУГАСЫ, СТАНАВЕЦЕСЯ У АВАНГАРДЗЕ УДАРНІКАЎ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ ПАЛЁЎ

Укараняючы зьдзельшчыну, ліквідуючы абязьлічку і шырока разгортваючы ўдарніцтва—правільна расставім сілы на ўсіх вучастках пасеўнага фронту. Ударнай работай на калгасных палёх уключым аднаасобніка ў сяўбу

НЕАДКЛАДНА СКОНЧЫЦЬ АБАГУЛЕНЬНЕ КОНЯЙ І ФУРАЖНЫХ ФОНДАЎ, АРГАНІЗАВАЦЬ ШЫРОКАЕ УЖЫВАНЬНЕ КОРМУ З ГАЛЬЛЯ

РУЙНУЮЧЫ УДАР ПА КУЛАКУ, ЯКІ АГІТУЕ ЗА РАЗБАЗАРВАНЬНЕ КОНЯЙ І КАРМОУ

Менск, 27 красавіка

Сяўба разгортваецца. У паўднёвых раёнах палявыя работы прынялі масавы характар. Перадавыя калгасы БССР адзначаюць пачатак сяўбы новым уздымам сацыялістычнага спаборніцтва. У радзе с.-г. арцеляй створаны ўдарныя брыгады большавіцкай сяўбы імя «518» і «1040». Энтузіязм калгаснікаў захапляе і аднаасобнікаў. У Камарынскім раёне аднаасобнікі ўліліся ва ўдарныя калгасныя брыгады і выйшлі арганізавана ў поле на сяўбу.

Сяўбу бягучага году мы абавязаны правесьці ў максымальна кароткі тэрмін. Гэта патрабуе баявой і выразнай арганізацыі ўсіх палявых работ. **Тут вядучую ролю павінны адыграць нашы саўгасы і МТС. Саўгасы і машына-трактарныя станцыі павінны ісьці ў авангардзе барацьбы за найкарацейшыя тэрміны сяўбы. МТС—арганізатар працы ў калгасах.** Гэта—найважнейшая задача кожнай машына-трактарнай станцыі.

Трэба, аднак, канстатаваць, што далёка ня ўсе МТС па-большавіцку змагаюцца за арганізацыю працы ў калгасах. Скрозь і ўсюды машына-трактарныя станцыі яшчэ не правялі патрэбнай работы па ўкараненьні зьдзельшчыны ў с.-г. арцелі. Перавод калгасаў на зьдзельшчыну, ацэненую ў працадніёх, у раёнах дзейнасьці МТС далёка ня скончан. Барацьбу машына-трактарных станцый за арганізацыю новага калгаснага прыліву яшчэ нельга прызнаць выстарчальнай. Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б з усёй сілай падкрэсьліў нездавальняючыя тэмпы калектывізацыі ў раёнах дзейнасьці МТС. Гэта ацэнка і зараз захоўвае ўсю сваю моц. Раёны, якія абслугоўваюцца МТС, на сёняшні дзень калектывізаваны ў сярэднім толькі на 26,8 проц. Гэта ганебная, зусім невыстарчальная, лічба. Тэмпы калектывізацыі трэба крута ўзьняць уверх. Машына-трактарныя станцыі павінны рашуча і неадкладна ўзмацніць сваю работу па арганізацыі новага калгаснага прыліву. Мы сёньня паказваем вопыт работы Смалявіцкай машына-трактарнай станцыі. На гэтай станцыі павінны раўняцца ўсе МТС. Смалявіцкая станцыя дабілася таго, што ўсе калгасы ў раёне яе дзейнасьці перайшлі на зьдзельшчыну з улікам у працадніёх. МТС распрацавала калгасам выразную разгорнутую праграму палявых работ. Гэты бліскучы прыклад трэба памножыць.

У радзе месц усё яшчэ пашырана шкодная тэндэнцыя супрацьставіць трактар жывой цягавай сіле. Гэта прыводзіць да недапушчальнага, проста злачыннага, ігнараваньня калгаснага каня. Факты, якія мы сёньня зьмяшчаем у «Зьвязьдзе», б'юць трывогу. Злачыннае разбазарваньне коняй і кармоў яшчэ ня спынена. Абагуленьне коняй у калгасах праходзіць надзвычай слаба. У цэлым радзе раёнаў пасеўная кампанія зусім незабясьпечана конскай цягавай сілай. Раённыя арганізацыі спадзяюцца на трактарны парк, а сані літаральна нічога ня робяць, каб падрыхтаваць каня да сяўбы. Час пакласьці канец гэтай агідзнасьці. У цяперашніх умовах трактар і конь—сваякасабліва таварышы. Трэба поўнасьцю захаваць усю наяўную конскую цягавую сілу. Рашуча змагаючыся з кулацкай агітацыяй, трэба забясьпечыць неадкладную арганізацыю конскіх брыгад для веснавой пасеўнай кампаніі. Ня меншую важнасьць мае задача неадкладна сабраць усе кармавыя фонды. Трэба разгарнуць самую найшырэйшую масавую работу за мабілізацыю кармоў у калгаснікаў. Зводка Наркамзему сьцвярджае, што мясцовыя арганізацыі не аддаюць зусім ніякай увагі збору кармавых фондаў. Процант выкананьня пляну па зборы кармоў ганебна мізэрны. Гэты злачынны прарыў павінен быць неадкладна ліквідаваны. У самыя бліжэйшыя дні кармы павінны быць сабраны.

БЮЛЕТЭНЬ № 23

Мы ўжо шчыльна падышлі да пачатку палявых работ. Тэлеграф усё часьцей і часьцей прыносіць весткі аб пачатку сяўбы ня толькі ў паўднёвых раёнах, але паваг і ў паўночна-заходніх. Зацяжная зіма скараціла тэрміны сяўбы. Гэта акалічнасьць прымушае праводзіць веснавую сяўбу з максымальным намаганьнем сіл.

Вынікі сяўбы пакажуць нам, як шэзавымі арганізацыямі была праведзена ў жыцьцё адозва ЦК УсеКП(б) ад 5 красавіка г г. па вузлавых пытаньнях веснавой сяўбы.

«Зьвязда пісала ўжо аб падрыхтоўцы каня да палявых работ і стварэньні фуражных фондаў. Апошняя зводка НКЗБ зноў прымушае вярнуцца да гэтага пытаньня. Становішча падрыхтоўкі конскай цягавай сілы і стварэньне фуражных фондаў прымушае біць трывогу.

На 20 красавіка фуражныя фонды створаны па грубых кармох толькі на 23,4 проц., а па канцэнтраваных—на 39,7 проц. Нельга не адзначыць і такога факту: апошняя дэкада дала **зьніжэньне** наяўнасьці фуражу ў параўнаньні з мінулай дэкадай: па грубых — на 2,7 проц, па канцэнтраваных — на 1 проц. Разбазарваньне кармоў пачалося да пачатку палявых работ. Гэтыя факты з усёй яскравасьцю паказваюць, што цягавай сіле пагражае недаяданьне, што значна адаб'ецца на тэмпах сяўбы. Рад мясцовых арганізацый па-апартуністычнаму аднесьліся да ўказаньняў цэнтральных устаноў па арганізацыі ветачнага корму. Парашылі ісьці па шляху найменшага супраціўленьня — разбазарваць кармы.

Абагуленьне коняй, і асабліва ў нова арганізаваных калгасах, злачынна зацягваецца. Сёньня мы друкуем матар'ялы з **Слуцкага** раёну, дзе на сёняшні дзень 20 проц. коняй знаходзіцца ў індывідуальным карыстаньні калгаснікаў, а ў **Вушацкім** раёне — 34,9 проц. Вось яскравы вынік праваапарту́ністычнай недаацэнкі гаспадарчага замацаваньня калгасаў з боку гэтых раённых арганізацый.

Па БССР мы маем за апошнюю дэкаду няпачны зрух па абагуленьні коняй. Так, на 10 красавіка прыпадала на адзін двор у калгасах 0,64 каня, а на 20 красавіка — 0,66 каня. Мы ня можам быць задаволены тым, што толькі ў апошнія часы спынілася зьмяншэньне процанту абагуленай жывёлы.

Пачатак палявых работ ставіць неадкладную задачу. Сёньня-ж трэба правесьці абагуленьне цягавай сілы і фуражу. Трэба рашуча паставіць пытаньне перад тымі калгаснікамі, якія адцягваюць абагуленьне асноўных сродкаў вытворчасьці і коняй. Раней гэту работу адкладалі да вясны. Вясна ўжо прышла і пара перайсьці ад слоў да справы. Скарочаныя тэрміны сяўбы з-за зацяжной **зімы прымушаюць па-ўдарнаму ліквідаваць хваты прарываў у падрыхтоўцы да палявых работ і выйсьці ў поле ў баявой гатоўнасьці.**

МТС—арганізатар працы ў калгасе

СМАЛЯВІЦКАЯ МТС у гэтым годзе будзе абслугоўваць 48 калгасаў. У гэтых калгасах сіламі МТС праведзена вялікая работа на арганізацыі працы на аснове зьдзельшчыны.

Ужо да 10-га красавіка ўсе калгасы пераведзены на зьдзельшчыну па ўсіх галінах гаспадаркі. Вось характэрныя нормы выпрацоўкі па паасобных галінах:

На паляводзтве. Ворыва двухконным адналяемешным плугам, норма выпрацоўкі—0,75 гэкт. Гэта праца адносіцца да сярэдняй і ацэньваецца ў 1 працадзень. Ворыва 2-хлямешным плугам, параконным, норма выпрацоўкі—1 гэкт. таксама ацэньваецца ў 1 працадзень.

Баранаваньне звычайнай бараной. Норма: 1,75 гэкт., ацэньваецца, як лёгкая праца—0,75 працадня. Баранаваньне бараною «Зіг-заг», норма—4 гэкт., ацэньваецца 0,75 працадня.

Дыскаваньне сярэдняй глебы. Норма выпрацоўкі—3 гэкт., ацэньваецца ў 1 працадзень. Пружынаваньне 9-зубовай бараной, норма—2,5 гэкт., ацэньваецца ў 1 працадзень.

Раскідваньне гною рукамі. Норма—0,30 гэкт., ацэньваецца — 1 працадзень.

Пасадка бульбы за плугам. Норма—0,20 гэкт., ацэньваецца, як лёгкая праца—0,75 працадня.

Трэба адзначыць, што Смалявіцкая МТС зусім своячасова распрацавала пытаньне аб арганізацыі працы на час уборкі ўраджаю. Нормы для ўборкі вызначаны такія:

Жніво жаткай-самаскідкай азімых—Норма выпрацоўкі—4 гэкт., яравых—6 гэкт. Гэта праца лічыцца цяжкой і ацэньваецца ў 1,25 працадня.

Вязаньне снапоў.—Норма—0,30 гэкт., ацэньваецца ў 1 працадзень.

Зграбаньне конными граблямі канюшыны ці збожжа. Норма—7 гэкт., ацэньваецца, як лёгкая праца, у 0,75 працадня.

Касьба сенажасілкаю.—Норма—4 гэкт., ацэньваецца ў 1 працадзень.

Касьба рукамі.—Норма—0,03 гэкт., ацэньваецца ў 1 працадзень.

Складаньне сена ў копы ла 1—1,5 цэнтнэры капа—ад 0,5 да 0,7 гэкт., ацэньваецца ў 1 працадзень.

Па жывёлагадоўлі ўстаноўлены такія нормы выпрацоўкі:

Догляд у зімовы час: а) кароў 20 шт., б) выпайваньне цялят 20 шт., в) догляд дарослых сьвіней 20 шт., г) падсьвінкаў да 1 году—30 шт., д) нарасят да 2-х м-цаў—50 шт.,—уся гэта праца адносіцца да разраду цяжкой і ацэньваецца ў 1,25 працадня.

Даеньне кароў пры 2-разовым даеньні—нагрузка 14 штук, пры 3-разовым—10 штук. Сярэдні ўдой прыняты ў 5-6 літраў малака.

Гэта праца ацэньваецца, як цяжкая, у 1,25 працадня. Пастух улетку даглядае 30 штук кароў. Гэта праца ацэньваецца ў 1 працадзень.

Па ўсіх калгасах, дзе праведзена зьдзельшчына, складзены брыгады па правядзеньні веснавой сяўбы. Зьдзельшчына ўжо ўжываецца ў жывёлагадоўлі і іншых работах і дала значны ўздым прадукцыйнасьці працы калгаснікаў.

У калгасе «Полымя», **раней 1 чалавек даглядаў 10-12 кароў, зараз даглядае 20 штук, пры лепшай якасьці працы. З калгасу «Перамога» езьдзілі ў Смалявічы за ўгнаеньнем ці машынамі да ўвядзеньня зьдзельшчыны адзін раз у дзень, пасьля пераходу на зьдзельшчыну—2 разы.**

Усе калгасы ухвалай сустрэлі арганізацыю працы на аснове зьдзельшчыны і ацэнкі яе ў працадніёх.

Сама МТС да сяўбы зусім гатова. Усе трактары ў спраўным выглядзе прымацаваны да поўных трактарыстаў. Гаручым і змазачным МТС забясьпечана.

Сампрамсаюз ня выканаў заказу на бочкі для развозкі газы, што складае небясьпеку з заводам гаручага на месца працы трактараў. З 70 зроблена толькі 20 бочак.

Трактары ўжо выяжджаюць у калгасы. Смалявіцкая МТС гатова выйсьці на штурм вышынь другой большавіцкай вясны.

К-ун.

Дубровенская МТС

ня мае помпаў для падачы нафты

ДУБРОЎНА. (Наш кар.). Дубровенская МТС гатова да выхаду ў поле. Гаручым па першы час станцыя забясьпечана. Не хапае помпаў для падачы нафты. Заяўкі на гэтыя помпы былі даны тры месяцы таму назад, але Белтрактарацэнтр не паклапаціўся дагэтуль прысылаць помпы. Гэта награжае перашкодамі ў рабоце МТС.

Пакончыць з месьніцкімі тэндэнцыямі

Забясьпечыць посьпех сяўбы ў „Загальні"

Саўгас **«ЗАГАЛЬЛЕ»** павінен засеяць у часе другой большавіцкай вясны 1.500 гэктараў, а іх—700 канапель. Работа на «Загальні» адбываецца ў вельмі цяжкіх умовах. Дарогі вельмі дрэнныя, чыгуначная станцыя знаходзіцца на адлегласьці 25 кілямэтраў.

У саўгасе не хапае тары для нафты, гэта награжае пасьпяховаму ходу сяўбы.

У Мазыры, недалёка ад «Загальля», рабочым саўгасу вылулены бак ёмістасьцю ў 23 тоны. Але старшыня мазырскага райвыканкому катэгарычна адмовіўся адпусьціць гэты бак, ня гледзячы на прапанову Наркамзему.

Трэба пакончыць з этымі месьніцкімі тэндэнцыямі, забясьпечыць пасьпяховы ход сяўбы ў саўгасе «Загальле».

Марчэнка.

Разгортваецца масавая сяўба

Першамайскі заклік у калгасы

ПЛЕШЧАНІЦЫ. (Наш кар.).

Калгасы «Чырвоны транспартнік», «Чырвоны рольнік», імя Сталіна, «Чырвоны штандар» і імя Валадарскага арганізавана пачалі палявыя работы і паказалі ўзор большавіцкай падрыхтаванасьці да сяўбы. Калгаснікі працуюць на аснове зьдзельшчыны.

Па прапанове калгаснікаў і аднаасобнікаў абвешчан першамайскі прызыў у калгасы.

20 калгасаў выйшлі ў поле

ЧАРЭЯ. (Наш кар.).

20 калгасаў пачалі сяўбу. За апошнія дзьве дэкады ў раёне арганізавана 28 новых калгасаў, у якія ўступілі 653 бяднацка-сераднцкія гаспадаркі. 40 калгасаў ужо перайшлі на зьдзельшчыну.

Дэкада першамайскага прыліву

ГРЭСК. (Па тэлеграфу).

Калгасы «Лекерт», «Чырвоныя расты», «Новае жыцьцё» і «Расьсьвет» пачалі сяўбу. Да 30-га красавіка ў раёне разгарнецца масавая сяўба.

З 25-га красавіка абвешчана дэкада першамайскага прыліву у калгасы.

ВЫХАД У ПОЛЕ
ВЫКЛІКАЎ НОВЫ ПРЫЛІЎ

БЯГОМЛЬ. (Па тэлеграфу). 25-га красавіка 7 калгасаў на чале з калгасам «Чырвоны баец» пачалі ворыва.

Выкананы масавы выхад у поле выклікаў новы прыліў у калгасы. Звыш 100 бяднацка-сераднцкіх гаспадарак уступілі ў калектывы.

Увесь раённы актыў знаходзіцца ў калгасах.

З ПАСЕЎНАГА ФРОНТУ

ХОЙНІКІ. (Па тэлеграфу). Калгаснікі і аднаасобнікі вышлі ў поле. Засеяна 32 гэктары.

***

ПАРЫЧЫ. (Па тэлеграфу). 17 калгасаў раёну пачалі сяўбу. Засеяна 8 гэктараў пшаніцы, 13 гэкт, аўса. Аднаасобнікамі засеяна пшаніцы 25 гэкт., аўса 32, жыта яравога 12, ячменю 31 гэкт.

***

ЮРАВІЧЫ. (Па тэлеграфу). Калгасы прыступілі да сяўбы.

***

ЖУРАВІЧЫ. (Наш кар.). Калгас «КАМІНТЭРН» 25 красавіка пачаў ворыва. Засрана 5 гэктараў.

Першамайскі прыліў

МЕНСК, 26. НА АБ'ЯДНАНЫМ СХОДЗЕ КАЛГАСЬНІКАЎ «СВАБОДА» І АДНААСОБНІКАЎ ПРЫГАРАДНАГА СЕЛЬСАВЕТУ ПРЫ АБГАВАРЭНЬНІ ПЫТАНЬНЯЎ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ 23 АДНААСОБНІКІ ПАДАЛІ ЗАЯВЫ АБ УСТУПЛЕНЬНІ Ў КАЛГАС, 18 ТУТЖА НА СХОДЗЕ БЫЛІ ПРЫНЯТЫ.

КАЛГАСЬНІКІ АБВЯСЬЦІЛІ СЯБЕ МАБІЛІЗАВАНЫМІ НА ЎВЕСЬ ЧАС ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ, ВЫКЛІКАЛІ НА САЦСПАБОРНІЦТВА ПА ВЫКАНАНЬНІ ВЕСНАВЫХ ПЛЯНАЎ І ПАСКАРЭНЬНІ ТЭМПАЎ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ КАЛГАСЫ ІМЯ «МЕНГАРСАВЕТУ» І «БАЛЬШАВІК» З ВЁСКІ АЗАРЫШЧА.

Менскія прыгарадныя калгасы выйшлі ў поле

МЕНСК, 26. Учора выйшлі на палявыя работы калгасы «Прабуджэньне» і «імя Варашылава» прыгараднага сельсавету. Гэтыя калгасы маюць садова-гародны ўхіл, яны прыступілі да апрацоўкі глебы пад раньнія агародныя культуры і вывазкі гною пад бульбу.

Кулакі разбураюць калгас „Новы шлях"

Да судовай адказнасьці шкоднікаў

НАРОЎЛЯ, 25. Калгас **«НОВЫ ШЛЯХ»** (вёска Дзёрнавічы) яднае 45 гаспадарак. Прыліву ў калгас няма, бо ён засьмечан кулакамі і заможнікамі, якія праводзяць там сваю шкодніцкую работу.

З яўна шкодніцкай мэтай сядзіба калгасу вынесена за вёску на адзін клм., размешчана ў лагчыне, якую цяпер заліла вада. Да хлявоў можна прабірацца толькі ў лодцы.

Беднякі, якія хацелі ўступіць у калгас з восені, атрымалі такі адказ: «На чорта вы нам, дармаеды супроць зімы». Пасьля такога адказу, вядома, заяў больш аб уступленьні ня было.

Зімой калгас амаль не працаваў. Лес і штучнае ўгнаеньне ня вывезена. Да веснавой сяўбы не рыхтаваліся. У лютым, пад уплывам пралезных у калгас заможнікаў, калгаснікі не працягу двух тыдняў усім ня выходзілі на працу. Увесь цяжар догляду за жывёлай быў ускладзены на 10 батракоў-кам самольцаў, з якіх зьдзекуюцца заможнікі.

На скотным двары «кіруе» нейкі прахадзімец Пахарэнка. За апошні час сталі часта «дупыцца» на прыязі 1 каровы, чаго не назіралася раней. Ёсьць западозранасьць, што тэта справа рук Пахарэнкі, які ўсілякімі мерамі вядзе калгас да развалу. Дзяжуючы натуральню праўленьня і Пахарэнкі, калгаснікі расьцягнулі для сваёй уласнай жывёлы 20 стагоў сена.

Гэта ўсё бачыць дзяпешні старшыня Філаненка, але Філаненка больш глядзіць за сваёй аднаасобнай гаспадаркай, чым за калгасам. Пахарэнка прыяцель Філаненкі, уся іх работа па развале калгасу ідзе ў цесным кантакце.

Патрэбны тэрміновыя і рашучыя захады да аздараўленьня Дзёрнавіцкага калгасу «Новы шлях».

П. Арцельны.

У дзьвёх нянек...

Саўгас М.-Сьляпянкі Не гатовы да сяўбы

Саўгас М.-Сьляпянка належыць адум інстытутам — сьвінаводчаму і расьліна-водчаму, якія маюць 60 навуковых працаўнікоў. Тут ужо нельга скардзіцца на недахоп спэцыялістаў.

Саўгас М.-Сьляпянка павінен быць прыкладам вядзеньня гаспадаркі для іншых саўгасаў і калгасаў. Аднак гэта далёка ня так.

Ня ледзячы на тое, што заўтра патрэбна выходзіць у поле М.-Сьляпянка, амаль не падрыхтавана да выкананьня пляну веснавой сяўбы. Штучнае ўгнаеньне ў колькасьці 5 вагонаў не завезена, што пры вопытным значэньні саўгасаў зьяўляецца простым зрывам працы.

Не хапае насеньня бульбы на 55 гэкт. (225 цэнтн.). Белкаапсаюз даў нарад на бульбу для саўгасу М.-Сьляпянка менскаму райспажыўсаюзу, які ня выканаў гэтага нараду.

Не хапае насеньня сэрадэлі на 15 гэкт.

Кармавы фонд ня створан, запасу фуражу хопіць ня больш як на тыдзень, і той знаходзіцца ў безгаспадарчым становішчы. Сечка, нарэзанал з сырой саломы, ужо «гарыць», жмыхі наваленыя кучамі ў пуні, ляжаць у граі. Салома таксама раскідана па ўсёй пуні і ўжо вытлела.

Саўгас крычыць пра недахват корму і ня бачыць таго, што корм марна гіне.

Асабліва дрэнна з арганізацыяй працы. Зьдзельшчына ў мінулым ня ўжывалася, ня ўжываецца яна і цяпер. Гэта справа адкладваецца да пачатку палявых работ. Аб брыгадах ніхто ня мае ўяўленьня, ня казучы ўжо аб дзяжурстве рабочага.

У саўгасе нядаўна здохлі дзьве каровы і некалькі цялят. Ня гледзячы на тое, што ў інстытуце маецца ветдоктар, да гэтага часу ня высьветлены прычыны падзяжу жывёлы.

Кантора саўгасу знаходзіцца ў Менску, усё кіраўніцтва вядзецца па тэлефону, што складае рад перашкод у гаспадарцы.

Саўгас М.-Сьляпянка мае ўсе ўмовы для таго, каб выканаць ускладзеныя на яго задачы.

Цікава, як глядзяць на такое становішча свайго саўгасу тыя 60 навуковых працаўнікоў, якія непасрэдна ў сваёй працы зьвязаны з ім.

Як—найхутчэй трэба выратаваць саўгас ад безгаспадарчасьці, забясьпечыць выкананьне пляну другой большавіцкай вясны.

П. АРЦЕЛЬНЫ.

Зьдзельшчына

дае новы прыліў

Калгасы **«НА БАРЦЕ» і «ЗАРА»**, абгаварыўшы ваданьне III Усебеларускага зьезду калгаснікаў, пастанавілі перайсьці на зьдзельшчыну. Нормы выпрацоўкі даведзены да кожнага калгасніка і зараз практычна праводзяцца ў жыцьцё. Уся рабочая сіла разьбіта на брыгады, а апошнія на зьвены. Да кожнага калгасніка прымацаваны конь і сельска-гаспадарчы інвэнтар.

Перавод на зьдзельшчыну выклікаў новы прыліў—за дэкаду ў гэтыя калгасы ўступіла 9 бяднацка-сераднцкіх гаспадарак.

Брыгада «Зьвязды»
В. БУНТАР і А АНЭТ.

да 1 мая скончыць кантрактацыю яравых

Зводні барацьбы за кантрактацыю

ЛЕЛЬЧЫЦЫ.

Кантрактацыя па раёне выкапана на 86 проц. Калгасамі плян кантрактацыі выканан на 46 проц., аднаасобнымі сэктарам — на 95 проц.

Плян кантрактацыі тэхнічных культур выканан на 161 проц., крупяных культур—127 проц., бульбы—86 проц., ячменю—79 проц., аўса—60 проц.

КАРМЫ.

На 21 красавіка па раёне закантрактавана калгасамі 436 гэкт. бульбы, або 79,2 проц. заданьня; 747 га ільну—91,7 проц., 276 га канапель — 90,9 проц., лубіну — 61,9 проц., вікі — 61 проц., канюшыны — 58,8, проц. гароху 35,7 проц., кораньплодаў 78,6 проц., збожжавых — 100 проц., садавіны — 100 проц. і сенажаці на 20,8 проц. Па аднаасобным сэктарам закантрактавана ільну 50 проц., канапель — 57,3 проц., аўса — 66,3 проц., ячменю — 84,7 проц., крупяных — 28,9 проц, бульбы — 80,7 проц., сена — 2,9 проц.

ТУРАВА.

На 22 красавіка па Тураўскім раёне закантрактавана яравых культур па аднаасобным сэктарам: аўса 81 проц. заданьня, калгасамі — 103 проц. заданьня; ячменю — аднаасобнікамі 67 проц., калгасамі—104 проц.; проса — аднаасобнікі 105 проц., калгасы —104 проц; ільну — калгаснікі 105 проц., аднаасобнікі—95 проц.; бульбы — аднаасобнікі—92 проц., і калгасы 203 проц.

Са спазьненьнем распачата кантрактацыя сена і кармавых траў.

Райком Крацэр.

ЧАШНІКІ.

На 21 красавіка па раёне закантрактавана 1.877 га, што складае 44 проц. заданьня. Па тэхнічных культур закантрактавана: ільну 541 гэкт., канапель 36 проц. заданьня, гародніны 106 процантаў.

Пухавіцкія апартуністы

одтэрміноўваюць кантрактацыю да скончэньня пасеўнай кампаніі

ПУХАВІЧЫ. Кантрактацыя яравых культур па раёне праходзіць надзвычай слаба. На 10 красавіка плян кантрактацыі па індывідуальным сэктары выканан усяго на 23 проц.

Галоўнай прычынай слабага выкананьня пляну кантрактацыі зьяўляецца недаацэнка гэтай важнейшай кампаніі з боку раённых арганізацый.

Райкаапсаюз зьвяртаецца да раённых арганізацый за дапамогай у справе правядзеньня кантрактацыі, але атрымлівае бюракратычны адказ, што эта выключна справа райкаапсаюзу.

Упаўнаважаны РВК і райкому КП(б)Б, накіраваны ў сельсаветы, нічога ня робяць для ўзмацненьня кантрактацыі. Так, упаўнаважаны па Кнорынскім сельсавеце «растлумачыў», што сельсавет зараз запят работай па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы, а таму справу па кантрактацыі трэба адкласьці да скончэньня пасеўнай кампаніі. У выніку сельсавет сапраўды адтэрміноўваў кантрактацыю да скончэньня пасеўнай кампаніі.

Другі ўпаўнаважаны Кудзін у Новасёлкаўскім сельсавеце бяз усякіх растлумачэньняў кінуў матар'ял па кантрактацыі, сказаўшы, што гэта работа выключна райкаапсаюзу, і што ўпаўнаважаны нічога не павінен рабіць па кантрактацыі.

У Новасёлкаўскім сельсавеце не прапрацавана адозва ЦК і СНК аб кантрактацыі. Старшыня сельсавету сам прызнаўся, што з-за адсутнасьці часу ён ня чытаў адозвы.

Гэты-ж упаўнаважаны Кудзін адтэрміноваў абгаварэньне пытаньня кантрактацыі на пленуме сельсавету да 29-га сакавіка, у той час, калі кантрактацыя павінна была быць скончана да першага красавіка.

У выніку такой работы былі выпадкі зрыву сходаў па кантрактацыі кулакамі.

Амаль такі-ж малюнак і па іншых сельсаветах.

Раённыя арганізацыі павінны безадкладна пераключыцца на выкананьне пляну кантрактацыі.

М.

Процант калектывізацыі падвоіўся

СЕНІЦКІ сельсавет (Менскі раён), пад кіраўніцтвам ячэйкі КП(б)Б, разгарнуў папулярызацыю пастаноў VI зьезду саветаў аб калгасным будаўніцтве. У выніку за кароткі час процант калектывізацыі па сельсавеце падвоіўся. 50 проц. бяднацка-сераднцкіх гаспадарак ужо аб'яднаны ў калгасах. За апошні час арганізаваны тры новыя калгасы. У калгас «Чырвоны спэцыяліст» уступіла 27 гаспадарак.

Не хапае насеньня тэхнічных і сіласных культур

НАРОЎЛЯ (наш кар.).

У Нараўлянскім раёне пачалася масавая сяўба. Адчуваецца недахоп насеньня тэхнічных і сіласных культур. Раймалжыўсаюз дагэтуль не разьмеркаваў паміж калгасамі насеньня гародніны.

Апартуністы чакаюць завозу насеньня

НАРОЎЛЯ. (Брыгадзір «Зьвязды»).

Нараўлянскія зямельна-калгасныя арганізацыі ня могуць адказаць на пытаньне — ці забясьпечан раён патрэбным насеньнем. Гавораць аб недахваце, але дакладнага ўліку няма. Аднак, цьвёрда можна сказаць адно — раён оваіх уласных рэсурсаў яшчэ не мабілізаваў, асабліва па лініі кармовых траў. Райкаапсаюз усіляк імкнецца даказаць, што «ў нашым раёне насеньня канюшыны, вікі і лубіну ня селлі, з гэтае прычыны праводзіць заготоўкі нямэтазгодна». Характэрна ўсё-ж, што пры адсутнасьці нават работы сабралі каля 40 проц. загатоўчага пляну гэтых культур.

Гэты факт сьведчыць, што пры належным разгортваньні загатовак нехапаючую колькасьць насеньня можна было-б набыць. Да гэтага часу не мабілізаваны і лішкі калгасаў. Так, у калгасе «Зьвязда» ёсьць лішак насеньня вікі 200 пуд. Насеньне не здаецца, а ідзе на корм жывёле. У калгасе «Пенкаў» ёсьць 300 пудоў лішку аўса, «Победа», які таксама ідзе на корм. Можна яшчэ прывесьці рад прыкладаў. Трэба адзначыць, што рашучай барацьбы з разбазарваньнем і зьнішчэньнем насеньня не вядзецца.

Агіднае становішча і з насеньнем бульбы. Раён дае НКЗ заяўку на завоз бульбы, а побач з гэтым сам ня выканаў заданьня па загатоўцы. Наогул замест мабілізацыі ўнутраных насенных рэсурсаў наглядаецца апартуністычная стаўка выключна на завоз. З гэтым шкодным зьявішчам трэба пакончыць.

П. Ч.

У дзьвёх нянек...

Саўгас М.-Сьляпянкі Не гатовы да сяўбы

Саўгас М.-Сьляпянка належыць адум інстытутам — сьвінаводчаму і расьліна-водчаму, якія маюць 60 навуковых працаўнікоў. Тут ужо нельга скардзіцца на недахоп спэцыялістаў.

Саўгас М.-Сьляпянка павінен быць прыкладам вядзеньня гаспадаркі для іншых саўгасаў і калгасаў. Аднак гэта далёка ня так.

Ня ледзячы на тое, што заўтра патрэбна выходзіць у поле М.-Сьляпянка, амаль не падрыхтавана да выкананьня пляну веснавой сяўбы. Штучнае ўгнаеньне ў колькасьці 5 вагонаў не завезена, што пры вопытным значэньні саўгасаў зьяўляецца простым зрывам працы.

Не хапае насеньня бульбы на 55 гэкт. (225 цэнтн.). Белкаапсаюз даў нарад на бульбу для саўгасу М.-Сьляпянка менскаму райспажыўсаюзу, які ня выканаў гэтага нараду.

Не хапае насеньня сэрадэлі на 15 гэкт.

Кармавы фонд ня створан, запасу фуражу хопіць ня больш як на тыдзень, і той знаходзіцца ў безгаспадарчым становішчы. Сечка, нарэзанал з сырой саломы, ужо «гарыць», жмыхі наваленыя кучамі ў пуні, ляжаць у граі. Салома таксама раскідана па ўсёй пуні і ўжо вытлела.

Саўгас крычыць пра недахват корму і ня бачыць таго, што корм марна гіне.

Асабліва дрэнна з арганізацыяй працы. Зьдзельшчына ў мінулым ня ўжывалася, ня ўжываецца яна і цяпер. Гэта справа адкладваецца да пачатку палявых работ. Аб брыгадах ніхто ня мае ўяўленьня, ня казучы ўжо аб дзяжурстве рабочага.

У саўгасе нядаўна здохлі дзьве каровы і некалькі цялят. Ня гледзячы на тое, што ў інстытуце маецца ветдоктар, да гэтага часу ня высьветлены прычыны падзяжу жывёлы.

Кантора саўгасу знаходзіцца ў Менску, усё кіраўніцтва вядзецца па тэлефону, што складае рад перашкод у гаспадарцы.

Саўгас М.-Сьляпянка мае ўсе ўмовы для таго, каб выканаць ускладзеныя на яго задачы.

Цікава, як глядзяць на такое становішча свайго саўгасу тыя 60 навуковых працаўнікоў, якія непасрэдна ў сваёй працы зьвязаны з ім.

Як—найхутчэй трэба выратаваць саўгас ад безгаспадарчасьці, забясьпечыць выкананьне пляну другой большавіцкай вясны.

П. АРЦЕЛЬНЫ.

20 проц. коняй

у індывідуальным карыстаньні

СЛУЦАК. Апартуністычная недаацэнка жывой цягавай сілы з боку раённых арганізацый ставіць пад пагрозу забясьпячэньне веснавой сяўбы патрэбнай цягавай сілай. На 2.405 бяднацка-сераднцкіх гаспадарак, якія аб'яднаны ў калгасы па раёне, абагулена рабочай жывёлы толькі 1.244 штукі. Да гэтага часу на калгасах раёну не абагулена да 20 проц. рабочай жывёлы.

Такое зьявішча тлумачыцца тым, што калектывізацыя раёну не ўвязалася з гаспадарчым замацаваньнем калгасаў.

Я. Жылка.

Усёй вёскай— у калгас

Атульны сход калгаснікаў і аднаасобнікаў вёскі **СТАРАСЕЛЬЛЕ**, Асьвейскага раёну, абмеркаваўшы пастановы VI зьезду саветаў, прызнаў што на даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва бедняку і серадняку-аднаасобніку нельга стаяць у старонцы, ня прымаючы ніякага ўдзелу ў калектывізацыі.

Уся вёска за выключэньнем кулацка-заможнай часткі, уступіла ў калгас.

Брагада «Зьвязды»
ГВ

Як адбывалася фашызацыя Віленскай беларускай гімназіі

Ахраньнік Астроўскі—у ролі пагромшчыка і ката беларускай рэвалюцыйнай вучнёўскай моладзі

Звыш 100 вучняў гімназіі былі перададены ім у рукі паліцыі, дзесяткі—уласнаручна былі зьбіты да крыві

Шчыт нагласьці і цынізму

Пратэст працоўных БССР супроць разгулу белага тэрору ў Зах. Беларусі і Зах. Украіне

У тэй антысавецкай кампаніі, якую вядзецца польскім фашысцкім і беларускім нацыянал-фашысцкім друкам, асцярлівым цынізмам, правакацыйнасьцю вызначаецца хлусьня беларускага нацыянал-фашысцкага друку, якім па ўказцы дэфэнзывы кіруюць Астроўскі, Луцкевіч і К°.

Мы ня будзем спыняцца на правакацыі, хлусьні і грязі, якая цэбрамі выліваецца дэфэнзыўнай шматай «Беларускім звонам» на СССР, асабліва на БССР. Нацыянал-фашызм зараз адкрыта выступае, як саюзьнік польскага фашызму, як яго агент у ролі душыцеля нацыянальна-вызваленчага руху працоўных мас у Зах. Беларусі.

Крывавыя каты нацыянальна-вызваленчага руху — Астроўскі, Луцкевіч і К° зьяўляюцца пагромшчыкамі беларускіх навуковых і культурна-асьветных таварыстваў, як ТБШ, Беларускага банку, каапэратываў і г. д., пагромшчыкамі «Грамады» і «Змаганьня». Аб'ік службе польскаму фашызму, правакацыйнай дзейнасьці, службе ў ахранцы ўсім добра вядома. Зараз паглядзімо, як тэзіны нацыянал-фашысцкія каты, служкі дэфэнзывы, насаджалі асьвету сярод працоўнай вучнёўскай моладзі Віленскай Беларускай Гімназіі, у той час, калі гімназія ня была яшчэ сфашызавана.

У 1928 годзе, калі фашысцкі суд у Вільні вынес катаржны прысуд над сялянска-работніцкай «Грамадой», Астроўскі і Луцкевіч прысягнулі польскаму фашызму верна служыць яму, шчыра выконваць абавязкі катаў і дапамагаць фашысцкаму ўраду бязьлітасна душыць вызваленча-рэвалюцыйны рух у Зах. Беларусі. За гэта фашысцкі суд апраўдаў іх на судзе і выдаліў з турмы.

Пасьля вызваленьня Астроўскага Луцкевіча з астрогу польскі фашызм даручыў ім сфашызаваць Віленскую Беларускую Гімназію, дзе вучыліся пераважна сыны рабочых і працоўнага сялянства. Адначасова даручана было ім разбурыць і іншыя школы Зах. Беларусі, дзе таксама вучыўся ненадзейны для фашызму элемэнт.

З сабачай вернасьцю кінуліся выконваць Астроўскі і Луцкевіч даручэньні сваіх гаспадароў. **Па іх даносе зараз-жа звольняецца дырэктар гімназіі Паўловіч і інш. настаўнікі,** варожа настроеныя да фашызму. Надыходзіць шыбы «крызіс» настаўніцкага персаналу, Астроўскі, Луцкевіч і К° займаюць іх месцы і прымаюцца памаленьку за фашызацыю гімназіі. Паступова ўлада ў гімназіі перайшла ў рукі Астроўскага і Луцкевіча. І вось пачынаецца **першы акт крывавай дзейнасьці нацыянал-фашыстаў.**

У першую чаргу імі праводзіцца грунтоўная чыстка ўсяго настаўніцкага персаналу ў гімназіі. Пасьля скапчэньня «чысткі» настаўнікаў нацыянал-фашысты прыступаюць да вучняў. Яны сьпярша пачынаюць цікавіцца, чым займаюцца вучні, што яны робяць. У гэты час іспаваў яшчэ вучнёўскі гурток — адзіная арганізацыя, якая асьведамляла працоўную моладзь гімназіі, накіроўвала яе на сапраўдную дарогу барацьбы за лепшую будучыню працоўных мас.

Ахраньнік — Астроўскі сьпярша прабуе аўладаць гэтым вучнёўскім гурткам, каб надаць яму фашысцкі напрамак, каб выхоўваць працоўную моладзь у прадажным духу і тым самым зрабіць з моладзі катаў працоўных мас і паслухмянае гарматнае мяса польскаму фашызму на выпадак вайны з Савецкім Саюзам. Ведаючы добра, што адкрыты замах на вучнёўскі гурток сустрэне рашучы адпор з боку ўсіх вучняў, Астроўскі прабуе **шляхам ашуканства і правакацый дасягнуць сваёй мэты.** Ён абяцае наладзіць клюб-чытальню, купіць радыё і інш., даў дазвол на выданьне вучнёўскай часопісі і насьценгазэты.

Але гэтыя «прывілеі» нядоўга іспавалі. Бачачы немагчымасьць правакацыйнымі мэтадамі падпарадкаваць сабе гурток вучнёўскай моладзі, ахраньнік Астроўскі наносіць першы ўдар. **Адразу забараняецца выдаваць часопісь. Першы нумар насьценгазэты за крытыку некаторых нацфашыстаў — настаўнікаў і іх адносін да вучняў канфіскуецца. Забараняецца ўступаць у гурток вучням малодшых кляс. Кожны вучань у прымусовым парадку абавязваецца ў суботу вечарам і па нядзелях хадзіць у царкву. У дысцыплінарным парадку вучні прымушаюцца браць удзел у сьвяткаваньні дня незалежнасьці фашысцкай Польшчы.**

Вучні на кампраміс не пайшлі. Яны адразу зразумелі, што Астроўскі зьяўляецца агентам дэфэнзывы, служкаю польскага фашызму. Маска з ахраньніка-правакатара Астроўскага была сарвана. Тады наносіцца другі ўдар па вучнёўскай моладзі — ліквідуецца гурток. Ахрамя гэтага, вучням абвяшчаецца, што за кожнае супраціўленьне, ці пратэст яны будуць звольняцца з гімназіі.

Але вучнёўская моладзь не здалася. Яна ня сьхіліла пакорліва галавы перад дэфэнзыўшчыкам Астроўскім.

Тады наносіцца па рэвалюцыйнай вучнёўскай моладзі трэці ўдар. **18-га сьнежня 1928 г. па ўказаньні Астроўскага і К° звальняюцца з гімназіі 30 вучняў старэйшых кляс і аддаюцца ў рукі паліцыі.**

У знак пратэсту супроць такога агіднага чыну Астроўскага і К°—пазасталыя вучні адказваюць забастоўкай. Пры падтрыманьні рэвалюцыйнага пралетарыяту Вільні пачынаецца ўпартая барацьба вучнёўскай моладзі супроць наступленьня фашызму. У гімназіі запанавала напружанае становішча. Дэфэнзыўшчык Астроўскі і К° актыўна дзейнічаюць супроць вучняў. **За кожнае слова супроць іх вучні бязьлітасна выкідаліся з гімназіі.** Аб звольненых 30 вучнях і ўспамінаць не дазвалялася, за кожную гутарку аб іх пагражала звальненьне.

Становішча вучняў было даведзена да крайнасьці. **Фашысцкі тэрор у адносінах да вучняў панаваў бязьмежна.** Вучнёўская моладзь пачала рыхтавацца да абароны — **да ўсеагульнай вучнёўскай забастоўкі.**

І вось прышоў дзень 28-га лютага 1929 году, — дзень, у які распачыналася паўторная расправа фашысцкага суда над «Грамадой» — апэляцыйны суд. На гэты дзень настаноўлена было абвясьціць усеагульную вучнёўскую забастоўку супроць фашысцкага тэрору, супроць фашызацыі беларускай гімназіі, супроць падрыхтоўкі бандыцкага нападу на СССР.

Астроўскі, прадчуваючы забастоўку, **яшчэ за некалькі дзён перад гэтым арыштаваў усіх звольненых вучняў, што жылі яшчэ ў Вільні.** Але дарэмныя спробы. Сарваць дэфэнзыўшчыкам, беларускім нацыянал-фашыстам усеагульную вучнёўскую забастоўку не ўдалося. Забастоўка выбухнула, ня гледзячы на шалёны тэрор, з неабычайнай сілай.

Ужо ў першы дзень забастоўкі нацыянал-фашысцкая зграя зразумела, што сваімі сіламі яны ня здолеюць задушыць забастоўку. **На дапамогу выклікаецца паліцыя. І вось Астроўскі — гэты правакатар і дэфэнзыўшчык становіцца на чале паліцыі і ўласнаручна ўказвае крывавым паліцэйскім катам, каго арыш тоўваць, уласнаручна разам з паліцыяй катуе вучняў. Многія вучні, як Тарасюк, Адамовіч,—Тэўпай, Гаўрылік і інш. былі зьбіты «абаронцам беларускага народу» — ахраньнікам, дэфэнзыўшчыкам Астроўскім да крыві. 70 вучняў былі перададены Астроўскім у рукі паліцыі. Прычым многія з іх яшчэ і зараз пакутуюць у казэматах фашысцкай Польшчы.**

І зараз гэты ахраньнік, правакатар, служка польскай дэфэнзывы, кат беларускай вучнёўскай моладзі і працоўных мас, гэты мэрзавец мае яшчэ сьмеласьць выступаць у ролі «абаронцы беларускага народу». Большага цынізму, большай нагласьці і ня прыдумаеш.

Як паведамляецца ўжо ва ўчарашнім нумары «Зьвязды» ў лісьце селяніна Зах. Беларусі, **працоўныя масы Зах. Беларусі шлюць праклёны агентам дэфэнзывы — беларускім нацыянал-фашыстам — катам і душыцелям працоўных мас, Крывавых учынкаў беларускіх нацыянал-фашыстаў працоўныя масы Зах. Беларусі ніколі не забудуць.**

Былы вучань.

Гарачае прывітаньне змагаром за сусьветны Кастрычнік!

Чым мацней эканамічны і палітычны крызіс ахапляе фашысцкую Польшчу, чым вышэй уздымаецца хваля рэвалюцыйнага руху супроць панаваньня фашысцкай дыктатуры, — тым больш крывава шалее акупанцкі тэрор у Зах. Беларусі.

Польскі фашысцкі ўрад шляхам узброенай інтэрвэнцыі хоча абмінуць тую гаспадарчую і палітычную катастрофу, да якой з надзвычайнай шпаркасьцю набліжаецца імпэрыялістычная Польшча.

Але магутнае разьвіцьцё рэвалюцыйнай барацьбы пралетарыяту і працоўнага сялянства ў Польшчы і нацыянальна-вызваленчага руху ў акупаваных Зах. Беларусі і Зах. Украіне руйнуюча б'е на ілачыных плянах польскага фашызму.

Разгромамі усіх палітычных і культурнаасьветных арганізацый, масавымі арыштамі і забойствамі ў лідзкіх, кобрынскіх і луцкіх ахранках польскі фашызм ачышчае пляцдарм і тыл для будучай вайны з СССР.

Агульны сход калектыву Дрыбінскай ШКМ і рабочых саўгасу шле свае гарачае прывітаньне рабочай клясе і працоўнаму сялянству Зах. Беларусі, якія гэрайчна змагаюцца за сусьветны Кастрычнік.

Узьнімаючы голас пратэсту супроць тэрору польскіх акупантаў, агульны сход абавязуецца па-ўдарнаму правесьці другую бальшавіцкую вясну і ўсімі сіламі ўзмацняць абароназдольнасьць краіны Саветаў. Апачасова сход заклікае да масавага ўступленьня ў рады МОПР'у, да павялічэньня матэрыяльнай і маральнай дапамогі палітзьняволеным фашысцкіх турмаў.

Сьмерць фашызму!

Няхай жыве гэрайчная барацьба працоўных мас Зах. Беларусі і Зах. Украіны!

Няхай жыве КПП і КПЗБ!

Няхай жыве сусьветны Кастрычнік!

Узмоцненым прылівам у калгасы—ударым па інтэрвэнтах

Разьвіцьцё рэвалюцыйнага руху ў Польшчы і магутны ўздым нацыянальна-вызваленчай барацьбы працоўных акупаваных Зах. Беларусі і Зах. Украіны перашкаджае зьдзяйсьненьню чанебных інтэрвэнцыйных плянаў польскага фашызму.

Каб зьнішчыць гэту перашкоду, фашысцкія акупанты разам з беларускім нацыянал-фашызмам, з **дэфэнзыўшчыкамі Астроўскім і Луцкевічам на чале,** распачалі сыстэматычныя пагромы нацыянальна-вызваленчага руху працоўных мас Зах. Беларусі. Разгром беларускага рабоча-сялянскага клюбу «Змаганьне», ліквідацыя ўсіх культурных і каапэратыўных устаноў, разгром ПНСЛівіцы, арышты і нябачаныя катаваньні ў засьценках польскіх дэфэнзыўшчыкіх прадстаўнікоў рабочае клясы і працоўнага сялянства—усе гэта гаворыць аб тым, што тэрмін інтэрвэнцыі вызначаны польскім фашызмам сумесна з сусьветнай буржуазіяй, вельмі і вельмі кароткі.

Агульны сход рабочых, калгасьнікаў і ўсіх працоўных м. Юравічы рашуча пратэстуе супроць нябачанага зьверскага тэрору, які фашысцкія акупанты, разам з беларускімі нац. фашыстамі, ужываюць у адносінах да працоўных мас Зах. Беларусі і Зах. Украіны.

У адказ крывавым катам агульны сход абяцае яшчэ цясней згуртавацца вакол камуністычнай партыі і, пад кіраўніцтвам яе ленінскага ЦК, аддаць усе сілы на пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі ў трэцім пяцігодзі. **Сход абавязваецца энэргічна, па-ўдарнаму, правесьці другую бальшавіцкую вясну, разгарнуць працу па арганізацыі новага шырокага прыліву ў калгасы.** Сход таксама пастанаўляе яшчэ больш узмацніць работу МОПР'у, праводзячы рашовыя зборы на дапамогу палітзьняволеным, якія пакутуюць у фашысцкіх турмах.

Няхай жыве КПП і КПЗБ!

Няхай жыве УсеКП(б)—ударная брыгада сусьветнага пралетарыяту!

Няхай жыве сусьветны Кастрычнік!

У адказ на тэрор—узмацняем дапамогу барацьбітам рэвалюцыі

Агульны сход членаў прафсаюзаў і ўсіх працоўных мястэчка Ельска ва ўхваленай рэзалюцыі пратэстуе супроць крывавага фашысцкага тэрору ў акупаванай Заходняй Беларусі і Зах. Украіне.

«У адказ на фашысцкі тэрор,—гаворыцца ў рэзалюцыі—працоўныя м. Ельска яшчэ шчыльней згуртуюцца вакол партыі Леніна, яшчэ актыўней будуць змагацца за выкананьне і перавыкананьне прамфінплану, за **узмацненьне абароназдольнасьці краіны пралетарскай дыктатуры».**

Сход пастанавіў хадайнічаць перад урадам аб выпуску пазыкі імя трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Сход адначасова прызнаў неабходным правядзеньне чысткі каласаў ад кулацкіх і варожых элемэнтаў.

Пры гэтым быў праведзен трашовы збор на дапамогу палітзьняволеным у фашысцкіх турмах, які даў 220 руб.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ АБ XI ПЛЕНУМЕ ВККІ

У пачатку красавіка ў Маскве адбыўся XI пленум Выканаўчага камітэту Камуністычнага Інтэрнацыянылу. XI пленум ВККІ заслухаў:

1) Даклад тав. **МАНУІЛЬСКАГА** аб задачах сэкцыі Камуністычнага Інтэрнацыянылу ў сувязі з паглыбленьнем эканамічнага крызісу і ўзрастаньнем у некаторых краінах прадпасылак рэвалюцыйнага крызісу і судаклады т. т. **ТЭЛЬМАНА, ЛЕНСКАГА і ЧАМАДАНАВА** аб становішчы і задачах КП Нямеччыны, КП Польшчы і КІМ:

2) Даклад тав. **КАШЭНА** аб небясьпецы ваеннай інтэрвэнцыі супроць СССР.

Пленум прыняў у склад КІ, як самастойныя сэкцыі, камуністычную партыю Інда-Кітаю, якая існуе некалькі год ў выглядзе сустаўной частні кампартыі Францыі і якая рэарганізавалася ў лютым 1930 году ў самастойную партыю; існуючую ўжо некалькі год камуністычную партыю вострава Кіпра і заснаваную ў лістападзе 1930 г. камуністычную партыю Ісьляндыі. Пастанова XI пленуму ВККІ аб прыёме новых сэкцый у КІ належыць зацьвярджэньню VII сусьветнага кангрэсу Камуністычнага Інтэрнацыянылу.

Пленум выбраў прэзыдыум у складзе 30 членаў і 12 кандыдатаў і зацьвердзіў фінансавую справаздачу ВККІ.

Усе пастановы былі прынятымі пленумам аднагалосна.

Тэзісы, рэзалюцыі і пастановы XI пленуму ВККІ публікуюцца адначасова з **гэтым паведамленьнем.**

ПАЛІТСАКРАТАРЫЯТ ВККІ.

Склад прэзыдыуму ВККІ

1) Арнот, 2) Барбэ, 3) Бэла-Кун, 4) Гарлэндзі, 5) Готвальд, 6) Гутман, 7) Катаяма, 8) Кашэн, 9) Коларай, 10) Ку Ан-пін, 11) Куусінэн, 12) Ленскі, 13) Лазоўскі, 14) Мануільскі, 15) Пік, 16) Попіт, 17) Прухняк, 18) Пятніцкі, 19) Рандольф, 20) Рэмэле, 21) Сілен, 22) Сталін, 23) Су, 24) Тэльман, 25) Торэс, 26) Фостэр, 27) Цэткін, 28) Чамаданаў, 29) Шмэраль, 30) Эрколі.

КАНДЫДАТЫ Ў ЧЛЕНЫ ПРЭЗЫДЫУМУ ВККІ

1) Бешковіч, 2) Браткоўскі, 3) Браўдэр, 4) Гусэў, 5) Кнорын, 6) Капленінг, 7) Мюпер, 8) Нэйман, 9) Тэлар, 10) Флорык, 11) Фурыні, 12) Фуруботэн.

ПРЭЗЫДЫУМ ВККІ НА СВАІМ ПАСЯДЖЭНЬНІ АД 15-ГА КРАСАВІКА 1931 Г. ВЫБРАЎ ПАЛІТСАКРАТАРЫЯТ Ў НАСТУПНЫМ СКЛАДЗЕ:

1) Гутман, 2) Кнорын, 3) Ку Ан-пін, 4) Куусінэн, 5) Ленскі, 6) Мануільскі, 7) Пік, 8) Попіт, 9) Пятніцкі, 10) Рандольф, 11) Тэльман, 12) Торэс, 13) Эрколі.

КАНДЫДАТЫ Ў ЧЛЕНЫ ПАЛІТСАКРАТАРЫЯТУ:

1) Арнот, 2) Браткоўскі, 3) Лазоўскі, 4) Тэлар, 5) Фурыні, 6) Чамаданаў.

КАМДЭПУТАТЫ ВЫКРЫВАЮЦЬ

Інтэрвэнцыянісцкія пляны польскага фашызму

Жандармэрыя ў сойме зьбівае тав. Рожэка

Бурнае пасяджэньне польскага сойму

ВАРШАВА, 25. Урадавая большасьць амаль бяз дыскусіі прыняла ў другім і трэцім чытаньні законапраект аб французкай пазыцы. Выступіўшыя ў спрэчках прадстаўнікі пэпэўсаўскай і эндэцкай «апазыцыі» вяла і бледна пярэчылі супроць урадавага праекту, падкрэсьліваючы, што яны не зьяўляюцца працілінкамі самога закону, але баяцца, што зьвязаныя з законам прывілеі для чужаземнага капіталу пагражаюць вялікадзяржаўнай самастойнасьці Польшчы. Міністар шляхоў зносін у сваёй прамове адзначыў, што ПРАЕКТ КАНЦЭСІІ ЦАЛКАМ ЗАБЯСПЕЧВАЕ ВАЕННЫЯ ІНТАРЭСЫ ПОЛЬШЧЫ.

КАМУНІСТЫЧНЫ ДЭПУТАТ ДАНЕЦКІ, указваючы на надзвычай цяжкае становішча працоўных у Польшчы, канстатаваў, што пазыка азначае новы дадатковы цяжар для рабочае клясы.

На гэтым прамова Данецкага была перарвана старшынёю сойму і, ня гледзячы на пратэсты, ДАНЕЦКІ БЫЎ ПАЗБАЎЛЕН СЛОВА, А ПОТЫМ І ВЫКЛЮЧАН НА АДНО ПАСЯДЖЭНЬНЕ.

За ўрадавую прапанову галасавалі, апрача беспартыйнага блёку, прадстаўнікі ўкраінскіх нацыяналістаў. У часе галасаваньня КАМДЭПУТАТ БУЖЫНСКІ ЗА ВОКЛІЧЫ «ДАЛОЎ КАНЦЭСІЮ, ЯКАЯ АРГАНІЗУЕЦЦА ДЛЯ ПАДРЫХТОЎКІ ВАЙНЫ СУПРОЦЬ СССР, ДАЛОЎ ФАШЫСЦКУЮ ДЫКТАТУРУ, ДАЛОЎ АШУКАНСТВА, ТАК ЗВАНАЙ «АПАЗЫЦЫІ» БЫЎ ТАКСАМА ВЫКЛЮЧАН НА АДНО ПАСЯДЖЭНЬНЕ.

У часе прамовы эндэка Стронскага старшыня сойму запрапанаваў апошняму закончыць прамову для таго, каб закрыць спрэчкі. У гэты час адзіны камуністычны дэпутат, ня выключаны яшчэ з пасяджэньня, ТАВ. РОЖЭК, накіроўваецца да трыбуны і на-хаду заяўляе: «МІЛЬЁННЫЯ МАСЫ РАБОЧЫХ І ПРАЦОЎНЫХ СЯЛЯН І ІХ РЭВАЛЮЦЫЙНЫЯ ПРАДСТАЎНІКІ Ў СОЙМЕ ВЫСТУПАЮЦЬ СУПРОЦЬ УРАДУ, СУПРОЦЬ ЯГО НЯЧУВАНАГА ГВАЛТУ І ТЭРОРУ». У залі падняўся неапісуемы шум. Пры шуме і крыках пілсудчыкаў Сьвітальскі заўляе АБ ВЫКЛЮЧЭНЬНІ ТАВ. РОЖЭКА НА АДНО ПАСЯДЖЭНЬНЕ. Не зьвяртаючы на старшыню ніякай увагі тав. Рожэк крычыць: «ВЫ ЗРАБІЛІ НОВАЕ ЗЛАЧЫНСТВА. ВЫ ЗАЦЬВЕРДЗІЛІ ЧЫГУНАЧНУЮ КАНЦЭСІЮ, ЯКАЯ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ЧАРГОВЫМ ЭТАПАМ АНТЫСАВЕЦКАЙ ІНТЭРВЭНЦЫЯНІСЦКАЙ КАМПАНІІ. ВЫ РЫХТУЕЦЕ ВАЙНУ СУПРОЦЬ СССР. РАБОЧАЯ КЛЯСА ПОЛЬШЧЫ АДКАЗВАЕ НА ГЭТА: «ДАЛОЎ ВАЙНУ, ДАЛОЎ ФАШЫСЦКІ ЎРАД».

Сьвітальскі ВЫКЛЮЧАЕ ТАВ. РОЖЭКА З СОЙМУ НА МЕСЯЦ І ВЫКЛІКАЕ СОЙМОВУЮ ВАРТУ. ПЯЦЬ СОЙМОВЫХ ЖАНДАРАЎ Б'ЮЧЫ ТАВ. РОЖЭКА КУЛАКАМІ І БОТАМІ, ВЫКІДАЮЦЬ ЯГО З ЗАЛІ. Тав. Рожэк, супраціўляючыся жандарам, крычыць на ўсю залю: «ДАЛОЎ СТАРШЫНЮ ФАШЫСЦКАГА СОЙМУ. ВАМ НЯ ЎДАСЦА ЗАКРЫЦЬ НАМ РОТ, МЫ НЕ БАІМОСЯ ВАШАГА ТЭРОРУ».

Пры агульным шуме і крыках сойм пераходзіць да «парадку дня», не галасуючы нават прапановы аб недавер'і ўраду. (ТАСС).

Адказ нар. ком. замежных спраў т. Літвінава генэральнаму сакратару Лігі Нацый

Народны камісар замежных спраў тав. **Літвінаў** накіраваў наступны адказ генэральнаму сакратару Лігі Нацый:

«Я атрымаў ваш ліст, датаваны 1-ым красавіка, у якім вы паведамляеце, што трэцяя сэсія камісіі па вывучэньні эўрапейскага крызісу адбудзецца 15-га мая ў 11 гадзін раніцы ў сакратарыце Лігі Нацый. Да вашага ліста дадан папярэдні парадак дня, які складаецца з трох пунктаў:

1. Даклад арганізацыйнай падкамісіі аб канстытуцыі, арганізацыі і мэтадах работы камісіі.

2. Прапанову аб удзеле вольнага гораду Данцыгу ў некаторых работах камісіі.

3. Эканамічныя пытаньні—сусьветны эканамічны крызіс, наколькі ён цікавіць усе эўрапейскія дзяржавы. Да параграфу з ёсьць заўвага, што, згодна пастановы студзеньскай сэсіі камісіі, прадстаўніцтвы Ісьляндыі, Турцыі і СССР будуць прадстаўлены пры абмеркаваньні камісіяй гэтага пункту парадку дня. Ці трэба разумець гэту заўвагу ў тым сэнсе, што пры абмеркаваньні пытаньняў парадку дня названыя ў ім тры дзяржавы не павінны быць прадстаўлены? Такое разуменьне, на мой погляд, пярэчыла-б непашанатковай пастанове камісіі. Гэта пастанова гаварыла, што камісія «паставила вывучаць сусьветны эканамічны крызіс, наколькі ён цікавіць усе эўрапейскія дзяржавы, і запрасіўшы пра генэральнага сакратара да ўдзелу ў гэтым пытаньні ўрады Ісьляндыі, Турцыі і СССР». Пакуль камісія ня ўключыла ніякіх іншых пытаньняў у кола свайго вывучэньня, пастанова азначае, што названыя ў рэзалюцыі тры дзяржавы прымаюць узел ва ўсіх работах камісіі. Прымаючы ўдзел ва ўсіх работах якой-небудзь камісіі, кожная дзяржава мае права вытыцяць свае адносіны да формы арганізацыі камісіі, яе канстытуцыі, яе складу і мэтадаў работы, бо гэтыя арганізацыйныя пытаньні ня могуць ня ўплываць на напрамак работ і нават на пастанову. Гэта права можа падлягаць запярэчаньню толькі ў тым выпадку, калі ўдзел якой-небудзь дзяржавы абмяжоўваецца пасобнымі пытаньнямі, але падобная пастанова ў адносінах СССР, Турцыі і Ісьляндыі камісія па вывучэньні эўрапейскага саюзу ня прымала.

Калі, такім чынам, пастанова арганізацыйнай падкамісіі азначае адхіленьне 3-х дзяржаў ад удзелу ў абмеркаваньні першых двох пунктаў парадку дня, дык яна ці супярэчыць студзеньскай пастановай пытаньня, якое, прынамсі, засталося адкрытым, а іменна пытаньнем аб удзеле, або ня ўдзеле 3-х эўрапейскіх дзяржаў у тых пытаньнях, якія камісіі магла-б потым дадаткова ўключыць у кола сваіх работ. Калі гэта пытаньне вырашаецца ў дадатнім сэнсе, дык «запрашаныя» тры дзяржавы маюць бясспрэчнае права на ўдзел у вырашэньні і арганізацыйных пытаньнях.

Адхіляючы тры дзяржавы ад удзелу ў гэтых пытаньнях, арганізацыйная падкамісія яўна выходзіць з меркаваньня аб прыцягненьні гэтых дзяржаў да вырашэньня пасобных, а ня ўсіх праблем, якія камісія сабе ставіць. Мне, аднак, невядома, чым тлумачыцца такое меркаваньне. Тлумачачы пастанову арганізацыйнай падкамісіі ў абмежаваным сэнсе, вы, п. генэральны сакратар, палічылі патрэбным паведаміць аб немагчымасьці вызначыць пэўны час пераходу камісіі да абгаварэньня трэцяга пункту парадку дня, думаючы, як відаць, што толькі да гэтага часу дэлегацыя СССР павінна прыехаць у Жэнэву. Вы, на жаль, таксама не зазначаеце, хто іменна можа гэты час вызначыць. Такім чынам, вы запрашаеце дэлегацыю 3-х эўрапейскіх дзяржаў прыехаць у Жэнэву, ня ўказваючы пэўнага тэрміну. Калі пасьля вашага першага запрашэньня ў сувязі з пан-Эўропай, указваючы на нявыразнасьць пастановы студзеньскай сэсіі камісіі, прышлося адначасьць, што «запрашаным» прыдзецца пасхаць у Жэнэву, каб дакладна даведацца для чаго іх запрасілі, то посьля вашага другога ліста прыходзіцца сказаць, што «запрашаным» прапануецца пасхаць у Жэнэву для таго, каб даведацца таксама, калі яны запрашаюцца туды. Я думаю, што іншыя прыклады падобных мэтадаў запрашэньня наўрад ці можна будзе знайсьці пры вывучэньні ня толькі Эўропы, але і па-за эўрапейскіх краін. Падобныя запрашэньні можна было-б аб'ектыўна тлумачыць, як правакаваньне адмовы прыняць запрашэньне, калі ня мець на ўвазе тэй ступені шчырасьці і прастадушша, якія зусім неабходны в боку арганізатараў такой важнай справы, як аб'яднаньне Эўропы. Просячы вас давесьці вышэйпаданае да ведама арганізатараў майскай сэсіі камісіі, я паведамляю, што дэлегацыя СССР гатова будзе прыехаць у Жэнэву між 15 і 25 мая і будзе чакаць дакладнага абвяшчэньня часу, да якога яна запрашаецца ў Жэнэву, прычым прашу мець на ўвазе, што яне ня зможа прыехаць туды з Масквы раней чым на чацьверты дзень пасьля атрыманьня паведамленьня.

Праграма другой бальшавіцкай павінна быць выканана

Прыгарадныя сельсаветы дрэнна падрыхтаваны да сяўбы

Пленум Менскага гаркому, які адбыўся ў лютым месяцы гэтага году, паставіў перад райпартарганізацыяй задачу разгарнуць работу па калектывізацыі і ўцягнуць да пачатку веснавых работ ня менш 60 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у калгасы. З таго часу, як адбыўся пленум прайшло больш двух месяцаў.

Ніякіх аб'ектыўных прычын, якія-б перашкаджалі выкананьню пастаўленай задачы ня было і няма. Наадварот, для яе выкананьня Менскі раён мае ўсе ўмовы. Блізасьць ад пралетарскага цэнтру прыгарадных сельсаветаў давала поўную магчымасьць ня толькі на паперы паставіць перад сабой адказьнейшую задачу, але правесьці яе на справе.

Месяцы, што заставаліся ад лютаўскага пленуму да сяўбы павінны былі быць ударнымі месяцамі работы вясковых ячэек. Бальшавіцкае правядзеньне ўсіх палітычных і гаспадарчых кампаній і агра-вытворчых мерапрыемстваў павінна было быць цесна зьвязана з работай па калектывізацыі і забясьпечыць да пачатку сяўбы поўнае выкананьне задачы, пастаўленай пленумам аб калектывізацыі 60 проц. двароў раёну.

У красавіку гэтага году адбыўся чарговы пленум Менгарсавету, які падагуліў вынікі выкананьня ранейшых пастаноў і праверыў падрыхтаванасьць раёну да сяўбы. Выявілася, што толькі два сельсаветы—**Гарадзецкі і Ратамскі** выканалі дырэктыву аб калектывізацыі — ўцягнулі ў калгасы 70 проц. бядняцка-серадняцкіх двароў.

У той час, як у **Падгайскім, Караліншчанскім, Н.-Дворскім і Бараўскім** сельсаветах калектывізацыя бядняцка-серадняцкіх гаспадарак не перавышае 9-12 проц., па раёне-ж калектывізавана гамест 60 проц. толькі 41,3 проц.

Ня лепш стаіць справа в правядзеньнем палітычна-гаспадарчых кампаній і падрыхтаванасьцю да сяўбы. Каля 15 проц. калгасаў ня маюць вытворчых плянаў. Усе новаарганізаваныя калгасы—без пасеўных плянаў, ня ведаюць колькі і чаго павінны будуць сеяць. Абагуленьне сродкаў вытворчасьці ў гэтых калгасах неданушчальна зацягвецца. У радзе сельсаветаў (Гатаўскі, Грычанскі і Падгайскі) не даведзены пасеўныя пляны да пасобнага двара, ня даны цьвёрдыя заданьні па пасеве кулацка-заможным гаспадаркам. Гэта з усёй выразнасьцю гаворыць аб наяўнасьці правай апартуністычнай практыкі ў рабоце некаторых сельсаветчыкаў і асобных парт'ячэек.

Палітычна - гаспадарчае значэньне зьвязельчыны, як вагару ўздыму працукцыйнасьці працы ў калгасах, бясспрэчна. Зьдзельчына будзе вырашаць посьпехі другой бальшавіцкай вясны. На жаль, некаторыя ячэйкі і сельсаветы недаацанілі гэтага важнейшага мерапрыемства. Перавод калгасаў і саўгасаў на зьвязельчыну праходзіць літаральна чарапашымі тэмпамі.

Падрыхтоўка цягавай сілы да палявых работ, стварэньне фуражных і насенных фондаў далёка яшчэ ня скончана. Абмен гатункова насеньня праведзен толькі на 20 проц. Плян кантрактацыі яравых выканан па калгасах толькі на 68 проц., а па адналасобным сэктары толькі на 66,5 проц. Прыгарадныя гаспадаркі МЦРК да гэтага часу не забясьпечаны рабочай сілай, насеньнем гародніны і кармамі.

Вось малюнак падрыхтаванасьці прыгарадных сельсаветаў да сяўбы і разгортваньня калектывізацыі.

Галоўнай прычынай гэтых ганебных паказальнікаў па некаторых сельсаветах зьяўляецца тое, што рад вясковых і некаторыя раённыя арганізацыі прайшлі міма радней даных партарганізацыяй дырэктыў. Слаба мабілізавалі масы на ажыцьцяўленьне дырэктыў лютаўскага пленуму гаркому, бавую работу на ажыцьцяўленьні гэтых дырэктыў падмянілі стаўкай на самацёк, праваапартуністычнай практыкай. Замест напружаньня сіл, разгортваньня масавай работы па калектывізацыі бавой падрыхтоўкі да сяўбы і рашучага наступленьня на кулака, у працы некаторых ячэек сельсаветаў, калгасаў і саўгасаў пануе ганебная бязьдзейнасьць.

У сваёй пастанове пленум правільна адзначыў прычыны гэтых ганебных прарываў, падкрэсьліваючы, што «ячэйкі КП(б)Б і сельсаветы і адпаведныя арганізацыі раёну не паставілі ў цэнтры сваёй работы сыстэматычнае правядзеньне масавай работы сярод калгасьнікаў, батрацтва, беднаты і серадняку». Пастановы сьнежаньскага пленуму ЦК УсеКП(б) лютаўскага пленуму гаркому КП(б)Б, VI зьезду саветаў, адозва ЦК і СНК аб кантрактацыі і закон аб адзіным сельска-гаспадарчым падатку да гэтага часу ня ўсюды растлумачаны ўсім калгасьнікам і бядняцка-серадняцкім масам сялянства.

Мала таго, асобныя вясковыя ячэйкі недаацанілі масавай работы, вынікам чаго і зьявіліся прарывы па важнейшых вузлавых пытаньнях падрыхтоўкі да сяўбы. Адпэй з прычын слабой работы нізавых арганізацый зьяўляецца бюрократычнае кіраўніцтва з боку раённых арганізацый гарсавету, райкалгасаюзу, райкаапсаюзу і райспажыўсаюзу. Замест жывой і практычнай дапамогі нізавым арганізацыям, раённыя арганізацыі часта займаюцца зборам непатрэбных вестак, рэвізіямі, пісаньнем шматлікіх цыркуляраў. Нават пасланыя ў калгасы брыгадыры і спэцыялісты з гораду засталіся без кіраўніцтва, у выніку чаго гэта пасылка не дала належнага эфэкту.

З гэтымі фактамі бюрократычнага кіраўніцтва некаторых раённых арганізацый павінна весьціся самая рашучая барацьба.

Неадкладнай задачай сёнешняга дня ўсіх вясковых і раённых арганізацый зьяўляецца тое, каб па-бальшавіцку ўзяцца за практычнае ажыцьцяўленьне вузлавых пытаньняў падрыхтоўкі да веснавой сяўбы. **Неадкладна скончыць стварэньне насенных і фуражных фондаў, перавесьці ўсе калгасы на зьдзельшчыну, ліквідуючы абязьлічку, давесьці поўнасьцю пасеўныя пляны да двароў і даць цьвёрдыя заданьні па пасевах кулацка-заможным гаспадаркам, поўнасьцю выканаць плян па кантрактацыі, перавесьці ўсе саўгасы на гаспадарчы разрахунак.** Пастановы VI зьезду саветаў і III зьезду калгасаў павінны праскакнуць ва ўсе шчыліны агра-вытворчай дзейнасьці зямельна-калгасных, вясковых і раённых арганізацый.

Ня менш важнай задачай усёй арганізацыі павінна быць шырокая работа сярод адналасобнага сэктару па падрыхтоўцы яго да сяўбы. Нельга забываць, што каля 60% бядняцка-серадняцкіх двароў будуць праводзіць сяўбу ў індывідуальным парадку. Поўнае выкананьне пляну засеву яравога кліну аднаасобным сэктарам павінна быць забясьпечана.

Шырока разгортваючы масавую работу сярод калгасьнікаў, батрацка-бядняцкіх і серадняцкіх мас, рашуча праводзячы наступленьне на кулака і вымятаючы ўсе кулацкія элемэнты з калгасаў дабіваюцца гаспадарчага замацаваньня калгасаў, — змагацца за далейшае разгортваньне калгаснага руху.

М. Л.

#

ПЕРАД ВЫХАДАМ У ПОЛЕ

ДАВЕСЬЦІ НОВЫ ЗАКОН АБ С.-Г. ПАДАТКУ

да кожнай вёскі, кожнага калгасьніка, бедняка і серадняка-аднаасобніка

Цесна ўвязаць правядзеньне с.-г. падатку з другой бальшавіцкай вясной, з кантрактацыяй, з мерапрыемствамі па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі

Памятаць, што кампанія сельска-гаспадарчага падатку—ня звычайная фінансавая работа, а адна з важнейшых масавых гаспадарча - палітычных кампаній

Выправіць скрыўленьні клясавай лініі ў індывідуальным абкладаньні

Пасьля перагібаў у правядзеньні калектывізацыі, дапушчаных вясной 1930 г., у радзе месц склалася шкодная думка аб тым, што кулак ужо ліквідаваны, што яго няма. У выніку гэтых правааапартуністычных настроеў да восені мінулага году ў 30 раёнах ня было зпойдзена ні аднаго кулака для індывідуальнага абкладаньня. Нават у лістападзе 1930 г. у 24 раёнах ні адна гаспадарка ня была абкладзена індывідуальна.

Праваапартуністычная „сьлепата"

Рад раённых арганізацый зусім забыліся аб тым, што індывідуальнае абкладаньне зьяўляецца вострай зброяй у руках партыі і ўраду для наступленьня на кулацтва. Прыплося ўжыць рад мер, каб прымусіць іх убачыць кулака, але і да 1-га студзеня ў 5 раёнах ня было знойдзена ні адной кулацкай гаспадаркі.

31-га сьнежня ўрад БССР выдаў спэцыяльную пастанову, паводле якой да 15-га студзеня павінны былі быць выяўлены ўсе кулакі, абкладзены індывідуальна і спагнаны з іх усе падаткі. Разам з гэтым урад катэгарычна забараніў абкладаць індывідуальна серадняцкія гаспадаркі.

Як-жа выканана гэта пастанова?

Пасьля выданьня пастановы адначыўся пэўны зрух у індывідуальным абкладаньні.

У некаторых раёнах, дзе раней зусім не знайшлі кулакоў, вылілі дасятки кулацкіх гаспадарак. Аднак, і на сёньняшні дзень у некаторых раёнах індывідуальнае абкладаньне не займае належнага месца ў штодзённай рабоце мясцовых арганізацый.

Дзе патураюць нулаку

Закон аб сельгаспадатку ўстанавіў для абкладаньня кулацкіх гаспадарак асаблівыя, больш высокія стаўкі падатку. Некаторыя фінансавыя аддзелы (Багушэўскі, Дрыбінскі, Полацкі, Пятрыкоўскі і Азарыцкі), ненакоіўшыся, што кулакі будуць пераабкладзены, палічылі ім падатак па стаўках для серадняцкіх гаспадарак.

Ельская раённая падатковая камісія не абклала індывідуальна арандатара паравога млыну і суканальні Ігнася Васькевіча, прычым райфінаддзел прызнаў неабходным хадайнічаць перад Наркамфінам аб памяншэньні звычайнага падатку тэтаму кулаку яшчэ на 26 р. 10 кап.

Прэзыдыум Заспаўскага райвыканкому вызваліў ад індывідуальнага абкладаньня ўласьніка вадзянога млыну Шэпсэвіча, палічыўшы яго за «бедняка».

У Асіповіцкім раёне кулакі, якія ў 1929-30 г. былі абкладзены індывідуальна і не раскулачаны, сёлета індывідуальна не абкладзены. Згодна закону, даходы кулацкіх гаспадарак вызначаюцца не паводле норм, а паводле сапраўдных прыбыткаў. Сельскія саветы былога Віцебскага раёну, зараз далучаныя да Багушэвіцкага раёну, вылічылі сапраўдны даход кулакоў у меншых разьмерах, чым паводле норм.

Капаткевіцкая падатковая камісія зрабіла «рэвалюцыйны гест», вызначыўшы сапраўдны даход кулакам на 8,—25 проц., больш норм. Загадчык-жа Расонскага райфінаддзелу даў устаноўку, што сапраўдны даход кулацкай гаспадаркі ня можа перавышаць 100 проц. даходу, вылічанага па норме.

„Лявацкія" загібы ў абкладаньні

Мы сустракаем побач з прымірэнчымі адносінамі да кулацкіх элемэнтаў—праявы «лявацкіх» загібаў у адносінах да серадняцкіх гаспадарак. Борквіцкая раёнпадатковая камісія вельмі доўга не магла знайсьці кулакоў. Нарэшце, яна знайшла іх. Грамадзянка мястэчка Борквічы—Дынкіна, якая мае 0,3 дзесяціны зямлі, адну карову і прыбытак ад здачы ў арэнду памяшканьня, абкладзена індывідуальна, прычым сапраўдны даход ад сельскай гаспадаркі гэтай «кулацкай» гаспадарні вызначан на 2.000 проц. больш парматыўнага даходу. Патрабавалася ўмяшаньне НКФ, каб райпадатковая камісія скасавала індывідуальнае абкладаньне.

Гр. вёскі Валынцы М. Фрэйдлін мае каля 1-й дз. зямлі, у яго няма ні каня, ні каровы і ён абкладзен індывідуальна за тое, што здае ў арэнду палову ўласнага дому пад пякарню Сампрамкаапэрацыі за 240 руб. у год. Сам Фрэйдлін—цырульнік, саматужнік дараваліцыйнага часу.

Гр. Мэерава, якая мае ½ дз. зямлі і палову каровы (адну карову на 2 сям'і), абкладзена індывідуальна за здачу райкалгасасоюзу ў 1929 г. будынку ў арэнду пад склад ільну. Мэерава ні аднэй капейкі арэнды не атрымала, бо будынкі згарэлі. Сапраўдны даход гэтай «кулацкай» гаспадаркі вызначан на 500 проц. больш парматыўнага даходу.

Беспадстаўнае абкладаньне ў індывідуальным парадку па Борквіцкім раёне носіць масавы характар.

У Касьцюковіцкім раёне таксама бяз усялякіх падстаў абклалі індывідуальна серадняцкія гаспадарні. У Бягомльскім раёне 43 серадняцкія гаспадаркі павінны плаціць індывідуальны падатак.

Факты спатнаня недаабкладаньня кулакоў і перагібаў у адносінах да серадняка можна тлумачыць толькі недаацэнкай палітычнага значэньня індывідуальнага абкладаньня. Вакол справы выяўленьня кулацтва не мабілізаваны калгасьнікі, батрацтва і бядняцка-серадняцкі актыў. Раённыя арганізацыі павінны пільна сачыць за выяўленьнем гаспадарак для індывідуальнага абкладаньня, рашуча выпраўляючы ўсе дапушчаныя памылкі.

340 тыс. руб. нядоімкі

Зусім недапушчальна ідзе спагнаньне падаткаў з кулакоў. Многія раённыя арганізацыі лічаць, што досыць вывэсіць кулака і абкласьці яго індывідуальна, а спатнаць падатак—гэта другарадная справа. Чым, як не злачынным патураньнем кулаку, можна тлумачыць такі факт, калі да 10-га красавіка з кулацкіх гаспадарак не спагнана каля 340 тысяч руб. Між тым, паводле дырэктыў, увесь падатак павінен быць спатнаны ў студзені.

26 раёнаў выканалі на 100 проц. заданьне па спагнаньні сельгаспадатку з кулакоў. Аднак, ёсьць рад раёнаў, якія ганебна плятуцца ў хвасьце.

Вузьдзенскі раён спагнаў толькі 26 проц. падатку з кулакоў, Лоеўскі—35,7 проц., Ельскі—35,9 проц., Смалявіцкі—43,2 проц., Ляднянскі—17,9 проц. Расонскі—48 проц., Пухавіцкі—49 проц. і г. д.

У руках фінансавага апарату і сельсаветаў ёсьць рад сродкаў, якія забясьпечваюць своячасовае і поўнае спагнаньне падатку з кулакоў, аднак, гэтыя сродкі ня ўжываюцца. Талачынскі райфінаддзел сьпісаў 36 тысяч руб. нядоімкі з кулакоў, Церахаўскі—звыш 4 тысяч. Гэта самы лёгкі спосаб ліквідацыі кулацкай нядоімкі. Навошта сварыцца з кулаком! Ёсьць шматлікія выпадкі, калі сельсавет дае кулаку адтэрміноўваньне на выплату падатку, а кулак тым часам разбазарвае маемасьць.

Раённыя пракуроры мала цікавяцца справай спагнаньня нядоімак.

Трэба ўжыць самыя жорсткія меры да кулакоў—нядоімшчыкаў. У фінансавым пляне першага кварталу ўключана ўся нядоімка з кулакоў. Яна павінна быць ліквідавана ў самым тэрміновым парадку.

МІХАСЬ.

Што павінен ведаць аб с.-г. падатку кожны калгасьнік, бядняк і серадняк—аднаасобнік

Правядзеньне сельгаспадатку 1931 году зьяўляецца важнейшай масавай грамадзка-палітычнай кампаніяй. Новы закон аб сельгаспадатку павінен адыграць выключную ролю ў справе ДАЛЕЙШАГА РАЗГОРТВАНЬНЯ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ, УЗДЫМУ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ, ПАШЫРЭНЬНЯ ПАСЕЎНАЙ ПЛОШЧЫ, РАЗЬВІЦЬЦЯ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ. Ён павінен спужыць аднай з асноўных зброй ЛІКВІДАЦЫІ КУЛАЦТВА ЯК КЛЯСЫ НА БАЗЕ СУЦЭЛЬНАЙ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ. Побач з гэтым новы сельгаспадатак мае вялікае фінансавае значэньне. Ён павінен даць па СССР каля 500 мільёнаў руб. на культурную і гаспадарчую перабудову вёскі. Гэтыя сродкі перадаюцца нізавому савецкаму бюджэту — с-с і раёну.

Трэба неадкладна РАЗГАРНУЦЬ ШЫРОКУЮ КАМПАНІЮ ПА РАСТЛУМАЧЭНЬНІ КОЖНАМУ КАЛГАСЬНІКУ, БЕДНЯКУ І СЕРАДНЯКУ СЭНСУ І ЗНАЧЭНЬНЯ НОВАГА ЗАКОНУ АБ СЕЛЬГАСПАДАТКУ. Там, дзе гэта праведзена, мы маем рад адпаведных паведамленьняў з месц, калгасьнікі, бяднякі і сераднякі ГОРАЧА ВІТАЮЦЬ НОВЫ ЗАКОН АБ СЕЛЬГАСПАДАТКУ, які зьяўляецца моцнай зброяй барацьбы за калектывізацыю.

Кожны бядняк і серадняк, які выяжджае на сяўбу, павінен ведаць аб перавагах, якія дае мовы закон, за пашырэньне пасеўных плошчаў, за пасеў тэхнічных культур.

Кампанія сельгаспадатку — адно з буйных мерапрыемстваў партыі і савецкай улады, — павінна сустрэць самую сур'ёзную ўвагу з боку ўсіх мясцовых арганізацый. Трэба мабілізаваць вясковую грамадзкасьць на барацьбу з кулацкім элемэнтам, які бязумоўна, разгорне агітацыю супроць новага падатку. Усякім спробам кулака скарыстаць той факт, што агульная сума падатку павышана, у параўнаньні з мінулым годам, трэба даць самы рашучы адпор.

Трэба растлумачыць шырокім колам бядняцка-серадняцкага сялянства і калгасьнікам, што агульная сума новага сельгаспадатку складае мізэрную долю — 2,5 ПРОЦ. ПРЫБЫТКАЎ СЯЛЯНСТВА і толькі 10 ПРОЦ. ТЫХ ВЯЛІЗАРНЫХ СУМ, ЯКІЯ САВЕЦКАЯ ЎЛАДА ВЫДАТКУЕ Ў 1931 Г. НА САЦЫЯЛІСТЫЧНУЮ ПЕРАБУДОВУ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ.

Трэба растлумачыць калгасьніку і аднаасобніку, што ЦЯЖАР ПАДАТКУ, НЯ ГЛЕДЗЯЧЫ НА ПАВЫШЭНЬНЕ СУМЫ ЯГО, НЕ ПАВЯЛІЧЫЎСЯ, БО У ВЫНІКУ ПАЛІТЫКІ ПАРТЫІ НА ВЁСЦЫ ДАХОДНАСЬЦЬ ВЁСКІ МОЦНА ЎЗРАСЛА.

Бядняк і серадняк павінен ведаць, што новы закон аб сельгаспадатку прадугледжвае вызваленьне значнай часткі даходаў калгасаў ад абкладаньня, што жывёлагадоўля ў калгасе і прырост пасеўных плошчаў па закону вызваляецца ад абкладаньняў, што ўводзіцца надзвычайнае ільготнае абкладаньне даходаў ад тэхнічных культур.

Закон аб сельгаспадатку г. г. стымулюе калгасны прыліў, дапамагае сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Новы сельгаспадатак, як і папаўшні, вызваляе ад абкладаньня беднату, ЗАХОЎВАЕ АСНОЎНЫЯ ІЛЬГОТЫ ВЫТВОРЧАГА ХАРАКТАРУ СЕРАДНЯКУ - АДНААСОБНІКУ і рашуча патрабуе не дапускаць аспабленьня пры індывідуальным абкладаньні кулацтва.

Паводле закону, абкладаюцца прыбыткі сераднякоў ад рэалізацыі сельгаспродуктаў па павышаных цэнах на прыватным рынку. Не абкладаюцца прыбыткі ад продажу тых прадуктаў, па якіх гаспадарка да часу ўліку выкакала свае абавязацельствы па кантрактацыі і загатоўках. Гэта дапаможа выканаваньню нашых плянавых заданьняў і кантрактацыйных дагавораў.

Баявая задача ўсіх нізавых савецкіх арганізацый і фінапарату — арганізаваць практычнае ажыцьцяўленьне закону аб сельгаспадатку.

Да прыезду М. Горкага ў СССР

САВЕЦКАЯ ГРАМАДЗКАСЬЦЬ СССР РЫХТУЕЦЦА ДА СУСТРЭЧЫ

ГЭТЫМІ ДНЯМІ ПРАЗ МЕНСК ПРАЯЖДЖАЕ МАКСІМ ГОРКІ

Старшынёю камісіі ЦСПСБ па спатканьні Максіма Горкага на станцыі Негарэлае і ў Менску назначан т. Адзінцоў

— Дэлегацыя з 300 лепшых рабочых ударнікаў нашых прадпрыемстваў, са сьцягамі і аркестрамі будзе спатыкаць Горкага на пэроне Менскага вакзалу.

— Культсэктар ЦСПСБ даў паказаньне бібліятэкам клюбаў мэталістаў, харчавікоў, саўгандальслужачых, друкароў і інш. аб арганізацыі выставак твораў Максіма Горкага, спэцыяльных вітрын і куткоў, дзе-б адлюстроўвалася мажліва паўнай літаратурная і грамадзка-палітычная дзейнасьць вялікага пралетарскага пісьменьніка.

— Вылучана дэлегацыя з прадстаўнікоў усіх пісьменьніцкіх арганізацый (БелАПП, «Полымя», «Узвышша», БелЛАЧАФ) для сустрэчы Горкага на станцыі Негарэлае.

— Праўленьне Дому пісьменьніка арганізуе ў першых лічбах мая вялікі вечар, прысьвечаны прыезду Максіма Горкага ў СССР. Для ўдзелу ў вечары прыяжджаюць з Масквы прадстаўнікі інстытуту літаратуры і мовы Камакадэміі.

Пісьменьнікі Менску —Максіму Горкаму

АГУЛЬНА - ГАРАДЗКІ СХОД ПІСЬМЕНЬНІЦКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ МЕНСКУ ВІТАЕ ВАС—НЯЗЛОМНАГА БАРАЦЬБІТА ЗА ПРАЛЕТАРСКУЮ РЭВАЛЮЦЫЮ, СТАРЭЙШАГА ПРАЛЕТАРСКАГА ПІСЬМЕНЬНІКА.

ЧАКАЕМ ВАС У МЕНСКУ — СТАЛІЦЫ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ. ПРОСІМ ЗАЕХАЦЬ ДА НАС.

МЫ ЎПЭЎНЕНЫ, ШТО І НАДАЛЕЙ ГОЛАС МАКСІМА ГОРКАГА БУДЗЕ МАГУТНА ГУЧЭЦЬ У БАЁХ ЗА СПРАВУ СУСЬВЕТНАГА КАСТРЫЧНІКА!

ПРЭЗЫДЫУМ.

35 дзён штурму прарываў

абвяшчае ЦСПСБ да 7-га зьезду прафсаюзаў

1-га Мая і другую гадавіну сацспаборніцтва адзначыць узмацненьнем інтэрнацыянальнай работы, арганізацыяй новага прыліву ўдарнікаў, узьняцьцем сацспаборніцтва на вышэйшую ступень

Да ўсіх членаў прафсыянальных саюзаў Савецкай Беларусі

ТАВАРЫШЫ!

Набліжаецца VII зьезд прафсыянальных саюзаў Беларусі. Зьезд зьбярэцца ў адказьнейшы гістарычны момант, калі пралетарыят краіны Саветаў, напружанымі бальшавіцкімі тэмпамі, пад кіраўніцтвам партыі Леніна, заваёўвае вышыні 3-га рашаючага году пяцігодкі, году завяршэньня фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР, рэканструкцыі сельскае гаспадаркі на сацыялістычных пачатках, ліквідацыі кулацтва як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі, разгорнутага будаўніцтва прамысловасьці.

XVI зьезд УсеКП(б) і XIII зьезд КП(б)Б далі разгорнутую праграму дзейнасьці прафсаюзаў, паставіўшы перад імі задачу: «БОЛЬШ САПРАЎДНАГА, НЕПАСРЭДНАГА ЎДЗЕЛУ Ў ГАСПАДАРЧЫМ БУДАЎНІЦТВЕ, ПАВАРОТУ «ТВАРАМ ДА ВЫТВОРЧАСЬЦІ».

Прафсаюзы, як найбольш масавыя арганізацыі пралетарыяту, якія аб'ядноваюць усю рабочую клясу, «ЗЬЯЎЛЯЮЧЫСЯ ШКОЛАЙ КАМУНІЗМУ», НАОГУЛ, ПАВІННЫ БЫЦЬ, У ПРЫВАТНАСЬЦІ, ШКОЛАЙ КІРАЎНІЦТВА САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЮ (А ПОТЫМ ПАСТУПОВА ЗЯМЛЯРОБСТВАМ) ДЛЯ ЎСЁЙ МАСЫ РАБОЧЫХ, А ПОТЫМ І ДЛЯ ЎСІХ ПРАЦОЎНЫХ». (ЛЕНІН).

Прафсаюзы Беларусі за пэрыяд ад VI да VII зьезду дабіліся пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі значных посьпехаў у справе ўцягненьня найшырэйшых рабочых мас у сацыялістычнае будаўніцтва, у справе разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Трэці рашаючы год пяцігодкі ставіць перад прафрухам задачы пагаполўнага прыцягненьня рабочае клясы і працоўных да практычнага ажыцьцяўленьня задач завяршэньня фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР.

У гісторыю барацьбы за пляны вялікіх работ трэці год будзе запісаны, як год нябачаных перамог. 518 новых сацыялістычных гігантаў, узброеных найноўшай тэхнікай, уступаюць у строй у гэтым годзе па Савецкім Саюзе, а іх пуск узмацніць сац. прамысловасьць БССР. 1.040 новых машына-трактарных станцый ужо ў гэтым годзе сваімі машынамі пачнуць узорваць сацыялістычныя палі Савецкага Саюзу. Дзесяткі новых МТС уступаюць у строй байцоў за калгасную Беларусь.

Нашы перамогі на гаспадарчым і культурным франтох прывялі да нячуванага росту пралетарыяту. У агні клясавых баёў, з адкрытымі і скрытымі інтэрэнтамі, у барацьбе з правым апартунізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, «левымі» перагібамі і прымірэнцтвам, вялікадзяржаўным шавінізмам, як галоўнай небясьпекай, контр-рэвалюцыйным нацыянал-дэмакратызмам і шавінізмамі розных коляраў, у бязьлітаснай барацьбе за ачыстку прафсаюзаў ад трэд-юніёнізму і старога апартуністычнага кіраўніцтва, у барацьбе са шкодніцтвам — загартоўвалася і ўзмацнілася 12-мільённая армія прафсыянальнага руху Савецкага Саюзу і моцным брацкім атрадам на мяжы з капіталістычным сьветам стала 300-тысячная армія членаў прафсаюзаў Савецкай Беларусі.

Узброеныя вопытам самадкладнай барацьбы за генэральную лінію партыі, за сацыялізм, прафсыянальныя саюзы Савецкай Беларусі, як кіколі згуртаваныя, прыходзяць да свайго VII зьезду, каб падагуліўшы вопыт будоўлі, ударнымі калёнамі разгортваць сацыялістычнае наступленьне па ўсім фронце, паглыбляючы перабудову работы прафсаюзаў па шляху далейшага павароту «тварам да вытворчасьці».

Прафсыянальныя арганізацыі, уся армія пралетарыяту, які аб'ядняецца прафрухам, абавязаны поўнасьцю падпарадкаваць усю сваю дзейнасьць задачам барацьбы за прамфінплян, задачам барацьбы за калектывізацыю сельскай гаспадаркі. Прафсаюзныя арганізацыі павінны мабілізаваць творчы энтузіязм і энэргію ўсёй масы членаў прафсаюзаў, каб працаваць тэмпамі, вартымі трэцяга рашаючага году. Трэба працаваць так, каб рабочыя клясы ўсяго сьвету, гледзячы на нас, магла сказаць: «ВОСЬ МОЙ ПЕРАДАВЫ АТРАД, ВОСЬ ЯНА, МАЯ ЎДАРНАЯ БРЫГАДА, ВОСЬ ЯНА, МАЯ РАБОЧАЯ ЎЛАДА, ВОСЬ ЯНА, МАЯ ПРАЛЕТАРСКАЯ БАЦЬКАЎШЧЫНА; ЯНЫ РОБЯЦЬ СВАЮ СПРАВУ — НАШУ СПРАВУ; ДОБРА, ПАДТРЫМАЕМ ІХ СУПРОЦЬ КАПІТАЛІСТАЎ І РАЗГОРНЕМ СПРАВУ СУСЬВЕТНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ».

Вынікі 1-га кварталу трэцяга рашаючага году пяцігодкі гавораць аб тым, што яшчэ НЯ ЎСЕ ПРАФСЭСЫЯНАЛЬНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ, НЯ ЎСЕ ГАСПАДАРНІКІ, НЯ ЎСЕ КААПЭРАЦЫЙНЫЯ ОРГАНЫ ПЕРАБУДАВАЛІ СВАЮ РАБОТУ ў барацьбе за выкананьне прамфінпляну, ня ўсюды стапі на чале актыўнасьці рабочых мас і не замацавалі посьпехаў ударнага кварталу.

Па радзе галін прамысловасьці ў 1-ым квартале ня выканан прамфінплян. Трэба намагчы ўсе сілы на ліквідацыю прарываў, на выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

Трэці год пяцігодкі — год нячуванага ўздыму прамысловасьці. У ГЭТЫМ ГОДЗЕ МЫ Ў ДВА РАЗЫ ПАВЯЛІЧВАЕМ ВЫРАБ ПРАДУКЦЫІ. Гэта — адказьнейшая гаспадарча - палітычная задача. Перад намі стаяць цяжкія, але ганаровыя задачы. Нам прыдзецца перамагчы рад труднасьцяй, зьвязаных з нашым ростам. Працоўным энтузіязмам пралетарыі Савецкай Беларусі перамогуць гэтыя труднасьці.

Лепшыя перадавыя фабрыкі і заводы Савецкай Беларусі «БАЛЬШАВІК», «КАСТРЫЧНІК» і «КАМІНТЭРН» на практыцы давялі, што нашы пляны, пляны трэцяга рашаючага году, зусім рэальныя. Раўнайцеся па перадавіках. Браць на грамадзкі буксір адстаючых.

Дапамагчы ў найкарацейшы тэрмін перабудаваць работу прафсаюзаў у барацьбе за прамфінплян — пралетарскі абавязак кожнага члена прафсаюзу, кожнага ўдарніка, кожнага рабочага, кожнай брыгады, групы, цэхавага, заводзкага камітэту.

Таварышы! Цэнтральны Савет Прафсыянальных Саюзаў Беларусі пачаў масавую падрыхтоўку да VII зьезду прафсыянальных саюзаў Беларусі. Гэтая падрыхтоўка будзе мець посьпех толькі тады, калі ўсе прафарганізацыі арганізуюць і стануць на чале актыўнасьці ўсёй масы членаў прафсаюзаў у справе баявой падрыхтоўкі да VII зьезду, якая павінна прайсьці пад знакам найшырэйшага разгортваньня пралетарскай крытыкі і самакрытыкі, пад знакам карэннай перабудовы прафсаюзнай работы тварам да вытворчасьці.

Паварот тварам да вытворчасьці — гэта бязумоўнае выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, асабліва ў якасных паказальніках, гэта пагаполўнае ўцягненьне прафсаюзнай масы ў сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, і перавод яго на ўсе вышэйшыя ступені (сквазныя брыгады, брыгады якасьці, грамадзкі буксір, рацыяналізатарскі рахунак і інш.), гэта карэнная перабудова работы вытворчых нарад у групе, брыгадзе, цэху і па прафсэкцыі.

Паварот тварам да вытворчасьці — гэта перанясеньне цэнтру цяжкасьці прафсаюзнай работы ў цэх, брыгаду, групу, агрэгат, вучастак.

Паварот тварам да вытворчасьці — гэта масавы рух за развьіцьцё і ўдасканаленьне тэхнікай пралетарскімі кадрамі, масавы ахоп рабочых вучобай, знаёмства з сваёй справай.

Паварот тварам да вытворчасьці — гэта гаспадарчы разрахунак ня толькі па ўсім заводзе, гэта гаспадарчы разрахунак ў цэху, брыгадзе, гэта арганізацыя ўдарніцтва і сацыялістычнага спаборніцтва вакол паляпшэньня зьнікжэньня сабекошту прадукцыі і павышэньня прадукцыйнасьці працы.

Паварот тварам да вытворчасьці — гэта масавае ўцягненьне добраахвотнікаў для работы ва ўсіх зьвеньнях прафарганізацый, штодзённае ўцягненьне іх у практычную работу прафсаюзаў,

гэта шырокая бальшавіцкая самакрытыка, як дзейкы мэтад нашай работы,

гэта своячасовая праверка і выкананьне пастаноў, гэта жывое кіраўніцтва,

гэта штодзённыя клопаты аб бытавых і матар'яльных патрэбнасьцях пралетарыяту, гэта паляпшэньне матар'яльнага, бытавога і культурнага абслугоўваньня рабочых — выразная работа каапэрацыі, шырокае разгортваньне прыгарадной гаспадаркі, гэта большая ўвага рабочым вядучых галін прамысловасьці.

Паварот тварам да вытворчасьці гэта бязьлітасная барацьба з бюракратызмам, у першую чаргу ў прафсаюзах, гэта шырокае разгортваньне шэфства над установамі, гэта сапраўднае ажыцьцяўленьне рабочага кантролю над апаратам.

Ажыцьцяўленьне павароту тварам да вытворчасьці немагчыма бяз выразнага правядзеньня ленінскай нацыянальнай палітыкі, без развіцьця нацыянальнай культуры, пралетарскай па зьмесьце і нацыянальнай па форме, бяз шырокага аўладаньня беларускай мовай, бяз шырокага абслугоўваньня нацменсьцяй на іх роднай мове, бяз уздыму інтэрнацыянальнага выхаваньня і культурнамасавай работы, арганічна зьвязанай з барацьбой за выкананьне пляну.

Паварот тварам да вытворчасьці — гэта сапраўднае кіраўніцтва пралетарыяту ў рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, гэта шпаркае разьвіцьцё калектывізацыі, гэта баявое правядзеньне другой бальшавіцкай сяўбы, гэта ўсямернае разьвіцьцё і ўзмацненьне шэфства, гэта перанясеньне і ўкараненьне вопыту і форм сацспаборніцтва заводаў і прадпрыемстваў у сацгаспадарку калгасаў, гэта перавод іх работы на зьдзельшчыну, гэта арганізацыя шырокай масавасьці, гэта раўненьне ва ўсёй рабоце на сапраўднага ударніка.

Гэта асноўныя задачы, гэта асноўныя шляхі і мэтады работы прафсаюзаў, якія забясьпечваюць выкананьне дырэктыў XVI зьезду УсеКП(б) і XIII зьезду КП(б)Б.

Цэнтральны Савет Прафсаюзаў падкрэсьлівае, што ўся работа прафсаюзаў у падрыхтоўцы да свайго чарговага зьезду павінна быць падпарадкавана гэтым адказным гаспадарча-палітычным задачам.

Падрыхтоўка да зьезду супадае з гістарычнымі датамі — інтэрнацыянальным сьвятам працоўных усіх краін — 1-га мая і другой гадавінай сацыялістычнага спаборніцтва. Трэба ўвязаць падрыхтоўку да гэтых дзён з падрыхтоўкай да зьезду.

Прафарганізацыі павінны ўзмацніць інтэрнацыянальную работу, папулярызаваць нацыянальную палітыку партыі. Няхай кожнаму члену прафсаюзу, кожнаму працоўнаму будзе растлумачана вялізарная розьніца эканамічных і палітычных абставін, у якіх будзе праводзіцца дзень 1-га мая ў нас — краіне будуючагася сацыялізму і там, за межамі — краінах белага тэрору і эканамічнага крызісу.

2 гады сацыялістычнага спаборніцтва—поўныя вялізарных перамог сацыялістычнай працы. Трэба яшчэ шырэй разгарнуць фронт спаборніцтва, арганізаваць новы прыліў ударнікаў, ударных брыгад імя «518», «1.040» і 7-га зьезду прафсаюзаў, узьняць сацспаборніцтва на яшчэ вышэйшую ступень.

Таварышы! Да зьезду прафсаюзаў засталося 35 дзён. ЦЭНТРАЛЬНЫ САВЕТ ПРАФСАЮЗАЎ БЕЛАРУСІ ЗАКЛІКАЕ ВАС ПЕРАТВАРЫЦЬ ГЭТЫЯ 35 ДЗЁН У ДНІ БАЛЬШАВІЦКАГА ШТУРМУ НАШЫХ ПРАРЫВАЎ, У ДНІ БЯЗЬЛІТАСНАЙ БАРАЦЬБЫ ЗА ПРАМФІНПЛЯН, У ДНІ БАЯВОЙ І РАШУЧАЙ ПЕРАБУДОВЫ ЎСІХ ЗВЕНЬНЯЎ ПРАФСАЮЗАЎ, У ДНІ БАЯВОЙ ПАДРЫХТОЎКІ ДА СВАЙГО VII ЗЬЕЗДУ.

Згуртаванымі калёнамі, пад сьцягам камуністычнай партыі, пад сьцягам пяцігодкі прыдзе пралетарыят Савецкай Беларусі да свайго зьезду прафсаюзаў.

Няхай жыве рабочая кляса СССР — ударная калёна сусьветнага пралетарыяту!

Няхай жыве камуністычная партыя!

Закрыўся ўсебеларускі зьезд рацыяналізатараў

ПАСТАНОВЫ ЗЬЕЗДУ РАЦЫЯНАЛІЗАТАРАЎ

давесьці да кожнай ударнай брыгады

Вакол пастаноў мабілізаваць масы рабочых, дабіцца новага прытоку рабочых прапаноў, далейшага разгортваньня рацыяналізатарскай работы

Першы ўсебеларускі зьезд рацыяналізатараў і вынаходцаў кончыў сваю работу. Зьезд прапрацаваў тры асноўных пытаньні: выкананьне прамфінпляну па рэспубліканскай прамысловасьці, стан рацыяналізацыі па ўсіх вучастках народнае гаспадаркі і якасьць выпусканай прадукцыі. Гэтым пытаньням зьезд прысьвяціў тры дні.

У прэзыдыум зьезду было ўнесена каля 30 прапаноў. Гэтыя прапановы пасьля адпаведнай распрацоўкі прынясуць вялікую карысьць. ВСНГ і адпаведныя гаспадарчыя арганізацыі павінны разгледзець у кароткейшы тэрмін гэтыя прапановы.

Ні пляну, ні ўліку

Аб чым гаварылі дэлегаты ў сваіх выступленьнях?

Загадчык бюро рацыяналізацыі Тэкстыльаб'яднаньня тав. Пільскі адзначыў, што:

З 563-х паступіўшых прапаноў, выканана 429, што дало 40.300 руб. эканоміі. За які тэрмін гэтыя прапановы паступілі і калі яны выконваліся — невядома. Плянаў рацыяналізацыі ня было раней і няма іх да гэтага часу.

Тав. Пільскі расказвае аб тым, што ВСНГ прасіла Тэкстыльаб'яднаньне вызначыць адну з фабрык, дзе-б можна было паказальна паставіць справу рацыяналізацыі.

— Мы вызначылі такую фабрыку,—гаворыць Пільскі,—паведамілі ў ВСНГ, але аноўні не адказаў і ніякіх указаньняў мы ад яго не атрымалі.

Зусім невыпадкова — кажа рабочы фабрыкі «Дзьвіна» тав. Кабельскі—наша фабрыка выканала праграму першага кварталу толькі на 85 проц. У нас вельмі многа розных адкідаў, (пыл і інш.), якія паводле прапановы рабочых павінны былі скарыстоўвацца на апад, што дало-б вялікую эканомію, але фабрычныя арганізацыі толькі абяцаюць узяцца за гэту справу.

Не разумеюць сувязі паміж рацыяналізацыяй і барацьбой за прамфінплян

Ёсьць яшчэ паасобныя гаспадарнікі, якія не разумеюць сувязі паміж рацыяналізацыяй і задачамі заводу па выкананьні прамфінпляну.

Дырэктар заводу «Пралетары» тав. Красноў, напрыклад, на просьбу рацыяналізатара азнаёміцца з плянам рацыяналізацыі заводу — адказаў:

— У мяне на заводзе прарыў, а вы з сваёй рацыяналізацыяй лезеце...

Пасьля доўгіх патрабаваньняў рацыяналізатара тав. Красноў замест азнаёмленьня з плянам рацыяналізацыі, мэханічна яго падпісаў. А калі прафсаюзныя арганізацыі запыталіся, чаму ня выконваецца плян, Красноў адказаў, што ён у вочы ня бачыў гэтага пляну...

Мэталяаб'яднаньне ня кіруе

Ужо прайшоў не малы тэрмін, як рацыяналізатар тав. Салавейчык напісаў дакладную запіску Краснову аб тым, якія рацыяналізатарскія мерапрыемствы трэба правесьці ў жыцьцё. Красноў адмовіўся чытаць гэту запіску, тады Салавейчык напісаў у Мэталяаб'яднаньне, але і там гэта запіска ляжыць бяз руху.

— Вы хочаце, каб Мэталяаб'яднаньне апэрацыйна кіравала ў Гомелі, — пытае рацыяналізатар заводу імя Варашылава тав. Іваноў, — яно і менскімі прадпрыемствамі кіруе... па тэлефоне. Звоніш, што адміністрацыя ня выконвае вашых дырэктыў, а Белмэталяаб'яднаньне аказвае: «што-ж мы можам рабіць, націскайце»...

Рабочы гомельскай швэйнай фабрыкі тав. Бэхер пытае:

— Калі-ж, урэшце, нашы прапановы будуць выконвацца бяз націскаў? Вось, прыклад: на нашай фабрыцы рабочы выпайшаў машыну для насьпілкі ваты. Гэта вынаходзтва хадзіла па ўсіх інстанцыях цэлы год і ўрэшце было прызнана нягодным. Мы пачалі націскаць на ВСНГ, аднак і ён ня стаў чаргу націскуў на Белшвэйаб'яднаньне, і вынаходзтва было прызнана. Машына зроблена, вельмі добра працуе і дае вялікую эканомію.

Выжыць злачынную растрату электраэнэргіі

Дэлегат зьезду тав. Кауфман зьвярнае ўвагу зьезду на тое, каб рацыяналізатары сур'ёзна ўзяліся з зьнішчэньнем страт электраэнэргіі.

— Мы яшчэ,—гаворыць Кауфман, — па-барбарску адносімся да энэргетычнай гаспадаркі. Уцечка энэргіі па Магілеве даходзіць да 25 проц., па Менску і іншых прамысловых цэнтрах — да 45 проц.

Гэтыя лічбы гавораць за тое, што ня толькі гаспадарчыя арганізацыі недастаткова удзяляюць увагі рацыянальнаму скарыстаньню электраэнэргіі, але партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі фабрык і заводаў не займаліся гэтым пытаньнем.

Распаўсюдзіць вопыт зав. „Бальшавік"

Справа рацыяналізацыі ўзорна пастаўлена на менскай гарбарні «Бальшавік». Загадчык бюро рацыяналізацыі тав. Бурдзянёў у сваёй прамове перадаў зьезду вопыт сваёй работы :

— Мы кожнае вынаходзтва даводзілі да кожнага рабочага, наладзілі фотавыстаўку вынаходзтваў. У сваіх бюлетэнях, якія вывешваліся на цэхах, мы адзначалі аўтара прапановы або вынаходзтва, паказвалі характар прапановы і колькі яно дае эканоміі, указвалі прозьвішча адказнай асобы, якая павінна ажыцьцявіць пр

Адгрузка бульбы прамысловым цэнтрам—
ПАД ПАГРОЗАЙ ЗРЫВУ

Сыстэмы Белкаапсаюзу і Белільнасаюзу працуюць чарапашымі тэмпамі

На 25-га красавіка адгружана толькі 4,9 проц. заданьня

У бліжэйшыя дні фарсаваць адгрузку. Прымусіць загатоўчыя арганізацыі узяць баявыя тэмпы. Рашуча ўдарыць па кулацкім сабатажы загатовак і адгрузкі бульбы. Прыцягнуць да судовай адказнасьці кулакоў, якія злосна ня выконваюць цьвёрдых заданьняў

Неадкладна дабіцца пералому

Тэмпы адгрузкі бульбы ў прамысловыя цэнтры Саюзу ўсё яшчэ застаюцца недапушчальна марудныміі. Яны не забясьпечваюць сваячасовага выкаваньня важнейшага заданьня партыі і ўраду — адгрузіць Маскве, Ленінграду і Украіне 61.600 тон бульбы.

Ня гледзячы на неаднаразовыя сыгналы друку, на шматлікія дырэктывы з боку вышэйшых партыйных і савецкіх органаў, загатоўчыя арганізацыі па мясцох не пераключыліся на баявыя тэмпы адгрузкі і ўсё яшчэ працуюць па-старому. У выніку па сёньняшні дзень становішча з адгрузкай пагражаючае. Паводле даных Белсадгародніны **на 25 красавіка было адгружана толькі 3.025 тон, або 4,9 проц. пляну. Белкаапсаюз выканаў 4,1 проц. пляну, Белільнасаюз—10,5 проц.**

Замест 400 вагонаў у дзень адгружаецца толькі 8-9 вагонаў. **За 24 красавіка было адгружана ўсяго 90 тон,** з якіх Белільнасаюз—30 тон, Белкаапсаюз—60 тон.

Кулацка-заможныя элемэнты ігнаруюць загатоўкі і вывазку бульбы, злосна ня выконваюць цьвёрдых заданьняў. Многія раённыя арганізацыі адносяцца прымірэнча да кулакоў, ня прымушаюць іх выконваць свае абавязкі.

Матар'ялы з месц, які мы сёньня друкуем, паказваюць, што раённыя загатоўчыя арганізацыі ня здолелі арганізаваць сапраўды бальшавіцкіх тэмпаў загатовак і адгрузкі бульбы, мабілізаваць масы працоўных на выкананьне важнейшых заданьняў. Праўленьні Белкаапсаюзу і Белільнасаюзу невыстарчальна кіруюць сваімі нізавымі сыстэмамі, не забясьпечваюць выкананьня апошнімі сваіх парадаў. Белкаапсаюз дэзарыентуе сваю нізоўку рознымі пярэчлівымі адна другой тэлеграмамі.

Трэба неадкладна дабіцца пералому як у загатоўках, так і ў адгрузцы бульбы. Заданьне—61.600 тон бульбы асноўным прамысловым цэнтрам—павінна быць выканана поўнасьцю і сваячасова.

Трэба рашуча ўдарыць па кулацка-заможных элемэнтах, якія злосна ня выконваюць цьвёрдых заданьняў, сабатуюць загатоўкі і вывазку бульбы. Мясцовыя арганізацыі павінны прыцягнуць кулакоў-сабатажнікаў бульбазагатовак да адказнасьці.

Поўнасьцю выканаць пляны адгрузкі

25-га красавіка на пасяджэньні **чацьвёркі ЦК КП(б)Б і СНК БССР па загатоўках** былі заслуханы даклады **Белкаапсаюзу, Белільнасаюзу, Белплодагароднінны і Наркамснабу** аб ходзе загатоўкі і адгрузкі бульбы ў прамысловыя цэнтры. **Чацьвёрка прызнала работу райвыканкомаў, райкомаў партыі, рэспубліканскіх і рэённых загатоўчых арганізацый у галіне загатовак і адгрузкі бульбы зусім нездавальняючай і прапанавала ім на працягу трох дзён дабіцца рашучага пералому ў гэтай справе.**

Чацьвёрка паказала ўсім раённым арганізацыям, што даныя заданьні па загатоўцы і вывазцы бульбы абавязковы для выкананьня і шякія разважаньні аб немагчымасьці невыкананьня пляну недапушчальны.

Раённым арганізацыям забаронена зьмяняць даныя ім Белсадгароднінай і каапэрацыйнымі сыстэмамі нарады. Забаронена таксама ўсякае выдаткаваньне бульбы для мясновых патрэб да поўнага выкананьня нарадаў Масквы, Ленінграду, Украіны і Ленвобласьці; 4) упаўнаважаным ЦК і СНК у 2-хдзённы тэрмін паведаміць ЦК і СНК аб сваёй працы па загатоўцы і адгрузцы бульбы. ЦК і СНК папярэджваюць, што калі ў бліжэйшыя дні не наступіць пералому, старшыні райвыканкомаў і ўпаўнаважаныя ЦК і СНК будуць прыцягнуты да адказнасьці».

Упаўнаважаным ЦК і СНК па раёнах паказана, што яны нясуць пэрсанальную адказнасьць за ход загатовак і адгрузкі бульбы побач з сакратарамі РК КП(б)Б і старшынямі райвыканкомаў.

Чацьвёрка папярэдзіла старшынь райвыканкомаў, сакратароў райкомаў, упаўнаважаных ЦК і СНК і загатоўчых арганізацый **Слуцкага, Чэрыкаўскага, Парыцкага, Старадарожскага, Быхаўскага, Жлобінскага і Глускага** раёнаў, што, калі на працягу бліжэйшых трох дзён у ходзе загатовак і адгрузкі бульбы ня будзе створан пералом, чацьвёрка будзе мець спэцыяльнае меркаваньне аб прыцягненьні іх да адказнасьці. Упаўнаважаным ЦК і СНК гэтых раёнаў адпачасова прапанавана паведаміць чацьвёрцы аб праробленай імі рабоце.

Цэнтральнаму і раённаму друку даручана неадкладна разгарнуць актыўную кампанію за выкананьне пляну загатовак і адгрузкі бульбы.

ТЭЛЕГРАМА т. т. ГЕЯ І КАЛНІНА

За подпісамі т. т. ГЕЯ і КАЛНІНА, усім райкомам КП(б)Б, РайКК-РСІ, райвыканкомам і ўпаўнаважаным ЦК КП(б)Б і СНК БССР накіравана тэлеграма наступнага зьместу:

«Ход загатовак і адгрузкі бульбы зрывае забясьпячэньне Масквы і Ленінграду, пасеўную кампанію Украіны, Ленінградзкай вобласьці, якія забясьпечваюцца бульбай БССР. Гэта сьведчыць аб поўнай бязьдзейнасьці райкомаў, райвыканкомаў, загатоўчых арганізацый і ўпаўнаважаных ЦК і СНК.

ЦК і СНК прапануюць: 1) у 3-х дзённы тэрмін дабіцца рашучага пералому ў бок павялічэньня загатовак і адгрузкі бульбы; 2) спыніць усякія хадайніцтвы аб зьмяншэньні пляну загатовак і адгрузкі; 3) спыніць усякае выдаткаваньне бульбы на мясцовыя патрэбы да поўнага выкананьня нарадаў Масквы, Ленінграду, Украіны і Ленвобласьці; 4) упаўнаважаным ЦК і СНК у 2-хдзённы тэрмін паведаміць ЦК і СНК аб сваёй працы па загатоўцы і адгрузцы бульбы. ЦК і СНК папярэджваюць, што калі ў бліжэйшыя дні не наступіць пералому, старшыні райвыканкомаў і ўпаўнаважаныя ЦК і СНК будуць прыцягнуты да адказнасьці».

48 тон замест 1467:

МСЬЦІСЛАЎЛЬ (наш кар.). Мсьціслаўскі райспажыўсаюз павінен на працягу вясны загатовіць 4.319 тон бульбы. З гэтай колькасьці 1.467 тон вызначана для адгрузкі ў прамысловыя цэнтры Саюзу.

Трэба канстатаваць, што на сёньняшні дзень бульбазагатоўкі па раёне ідуць **зусім нездавальняюча.** Замест 1.467 тон, **да гэтага часу адгружана толькі... 48 тон.**

Райкаапсаюз таксама бязьдзейнічае. Паводле пляну ён павінен быў да гэтага часу адгрузіць 100 тон бульбы ў Маскву, аднак, нарад на адгрузку ня выконваецца. Райкаапсаюз нічога ня робіць для забясьпячэньня выкананьня заданьня.

Цьвёрдыя заданьні кулацка-заможнымі гаспадаркамі злачынна ня выконваюцца. Кулакі ўсякімі мерамі імкнуцца сарваць бульбазагатоўкі. Раённыя арганізацыі ня ўжываюць рашучых мер для барацьбы з кулацкім сабатажам, ня прымушаюць кулацка-заможных элемэнтаў выканаць свае заданьні.

Трэба зараз-жа дабіцца аруху ў ходзе загатовак і адгрузкі бульбы. Пляны павінны быць поўнасьцю выкананы. Райкаапсаюз і райспажыўсаюз павінны неадкладна пераключыць работу на баявыя тэмпы.

М.

Як Белкаапсаюз кіруе сваёй сыстэмай
Аб дзьвёх супярэчлівых тэлеграмах

Сыстэма **Белкаапсаюзу** вельмі дрэнна спраўляецца з загатоўкамі і адгрузкай бульбы. Белкаапсаюз слаба кіруе сваёй нізоўкай і фактычна вельмі мала робіць для фарсаваньня загатовак і адгрузкі бульбы.

Яшчэ больш: Белкаапсаюз іншы раз проста дэзарганізуе работу. Вось характэрны факт. **Борквіцкі** раёс—адзін з адстаючых раёнаў у адгрузцы бульбы. Нарады на адгрузкі сыстэматычна раёнам ня выконваліся. Здавалася-б, што Белкаапсаюз павінен быў ужыць меры для ўзмацненьня работы борквіцкіх загатоўчыкаў, дапамагчы ім выканаць сваё заданьне.

Што-ж мы маем на справе? 5 красавіка **сэктар загатовак Белкаапсаюзу** накіроўвае наступную службовую запіску Борквіцкаму раённаму спажывецкаму таварыству: «Паведамляем, што па пастанове Наркамснабу БССР ваш раён ад вывазу бульбы за межы БССР вызваляецца; таму даны вам нарад на тэлеграфу 24 сакавіка 1931 г. на адгрузку 100 тон бульбы ЛСПО скасоўваем. Сэктар загатовак».

Між тым, у гэты-ж раён некалькі пазьней накіравана тэлеграма тав. Балціна на адрас райвыканкому: «Нарады на вываз бульбы прамысловым цэнтрам злачынна ня выконваюцца. Гэта цяпне за сабой зрыў важнейшых заданьняў ураду. У апошні раз прашу праверыць нарады райспажыўсаюзу і райкаапсаюзу, узьняць тэмпы вывазу бульбы, стварыць сапраўдны пералом у адгрузцы. Папярэджваю, што нестварэньне пералому да 12 красавіка прымусіць прыняць асобыя меры. Наркамснаб Балцін».

Як-жа магло здарыцца, што з аднаго боку барквіцкія загатоўчыкі атрымліваюць тэлеграму аб скасаваньні нарадаў на адгрузку бульбы, а з другога боку—тэлеграму аб неабходным фарсаваньні адгрузкі. Інакш, як недапушчальна дрэнным кіраўніцтвам загатоўкамі, дэзарганізацыяй і дэзарыентоўкай нізавой сыстэмы з боку апарату Белкаапсаюзу, гэтага назваць нельга.

Л—вы.

Большасьць сельсаветаў Случчыны спыніла бульбазагатоўкі

СЛУЦАК (наш кар.). Веснавыя загатоўкі бульбы па Слуцкім раёне праходзяць вельмі дрэнна. Большасьць сельсаветаў зусім спыніла загатоўкі. Да гэтага часу не спагнаны яшчэ цалкам цьвёрдыя заданьні з кулацка-заможных гаспадарак. Сельсаветы ня ўжываюць ніякіх мер для ўзмацненьня бульбазагатовак.

Я. Жылка.

Стварэньне „Беларускага Аб'яднаньня Пралетарска-калгасных Пісьменьнікаў"
Шырэй работу па ўцягненьні ўдарнікаў калектыўных палеткаў у рады пралетарска-калгаснай літаратуры!

25-га красавіка 1931 году ўвойдзе, як вельмі важная дата, у гісторыю беларускай літаратуры. У гэты дзень агульны сход пісьменьнікаў гораду Менску (усіх аб'яднаньняў) ухваліў арганізацыю новага аб'яднаньня—пралетарска-калгасных пісьменьнікаў БССР.

Сход заслухаў даклады прадстаўнікоў ЦК «ВОПКП» т. т. **Багданава і Ягорашвілі** і паведамленьне арганізацыйнага камітэту па стварэньні аб'яднаньня.

***

Тав. **А. Багданаў** падсумаваў вопытам работы ўсерасійскага аб'яднаньня пралетарска-калгасных пісьменьнікаў (ранейшае «ВОКП»), якое існуе ўжо каля 6 год.

Ён адзначыў, што «ВОКП'у прыходзілася ўвесь час весьці барацьбу **на два франты.** З аднаго боку, з так званай палошчынай, якая імкнулася разуменьне «сялянская літаратура» падмяніць разуменьнем «вясковае» літаратуры, адносячы да сялянскіх такіх кулацкіх пісьменьнікаў, як **Клюеў, Клычкоў, Есенін.** З другога—з меншавіцка-трацкісцкімі ўстаноўкамі адмаўленьня ролі і значэньня сялянскай літаратуры, са спрашчэньствам, падзелам усяе літаратуры толькі на пралетарскую і буржуазную. Трэ' было даводзіць, што сялянская літаратура—гэта літаратура тэй групы, якая ідзе разам з пралетарыятам, пад яго кіраўніцтвам.

Зусім зразумела, што прад «ВОКП'ам» заўсёды стаяла задача, пастаўленая яшчэ ў 1925 годзе цэнтральным камітэтам УсеКП(б), аб **«пераводзе сялянскіх пісьменьнікаў на рэйкі пралетарскай ідэалёгіі».** Гэта задача зьяўляецца актуальнейшай і зараз.

— За апошні час вельмі зьмяніўся твар нашых кадраў,—гаворыць т. Багданаў: зараз мы, пралетарска-калгасныя пісьменьнікі, апіраемся, галоўным чынам, па сельска-гаспадарчых рабочых і членаў калгасаў. Сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі, магутная хваля калгаснага прыбою дыктуе неабходнасьць шырокага ахопу і кіраўніцтва новымі літаратурнымі сіламі, што ідуць слова ад імя арганізацыйнага камітэту даецца **Іп. Барашку.**

— Арганізацыйны камітэт пачаў сваю работу 21-га красавіка. У склад яго ўвайшлі т. т. **Галавач, Барашка, Баранавых, Шукевіч-працьцякоў і рэдактар газэты «Калгасьнік Беларусі».** Арганізацыйны камітэт вызначыў арыентовачны плян работы, які падасьцца на абгаварэньне агульнага сходу пісьменьнікаў.

Паводле гэтага пляну ўхвалена стварыць філіі аб'яднаньня пралетарска-калгасных пісьменьнікаў у першую чаргу там, дзе існуюць філіі БелАПП'у—у **Віцебску, Полацку, Бабруйску, Гомелі, Горках.** Асноўнае ядро аб'яднаньня складуць белапаўцы, у яго ўвойдуць таксама пісьменьнікі з «Полымя» і «Узвышша», найбольш блізкія да задач пралетарска-калгаснай літаратуры. Распачатая работа па ўцягненьні ў рады Аб'яднаньня ўдарнікаў першым чынам букнёвых гаспадарак: калгасу «Расьсьвет—пераможца», камуны імя БВА, Койданаўскай МТС. Наладжваецца сувязь з гаспадарчымі арганізацыямі — Белкалгасцэнтрам, Белсельтрэстам.

Уся дзейнасьць новага аб'яднаньня будзе праходзіць у шчыльнай сувязі з брацкімі арганізацыямі РСФСР, УССР, ЗСФСР («ВОПКП», «Плуг» і інш.).

Аб'яднаньне будзе мець свой орган,—штомесячную часопісь, паперам у тры друкаваныя аркушы. Адной з важнейшых галін работы Беларускага Аб'яднаньня Пралетарска-калгасных Пісьменьнікаў, будзе сыстэматычнае асьвятленьне ў ім фашысцкага тэрору ў Зах. Беларусі.

У спрэчках выказаліся т. т. **Ліманоўскі, Процька, Кучэр і Галавач.** Усе прамоўцы падкрэсьлівалі актуальнасьць арганізацыі новага аб'яднаньня і вялікую адказнасьць задач, што стаяць прад ім.

***

Сход пісьменьнікаў паслаў прывітальную тэлеграму **Максіму Горкаму.**

Юр. Лявонны.

Па Савецкай Беларусі

Патураюць кулацкаму сабатажу

ЧАРЭЯ (наш кар.). Чарэйскі райфа праяўляе апартуністычныя адносіны да спагнаньня падаткаў і плацяжоў з кулацка-паманскіх элемэнтаў. У В. Хальнявіцкім сельсавеце не спагнана—з кулака Сабалеўскага 270 руб.—самаабкладаньня, 270 руб.—падатку, 352 руб.—аднаразовага збору, з кулака Крыніцкага—192 руб.—падатку, 192 руб.—самаабкладаньня, 260 руб.—аднаразовага збору; на Дубаўскім сельсавеце не спагнана з кулака Нябеда 380 руб.—падатку, 380 руб.—самаабкладаньня, 370 руб.—аднаразовага збору, з А. Сёміка 96 руб.—падатку, 280 руб.—самаабкладаньня, 280 руб.—аднаразовага збору. Наогул па раёне сабрана толькі 60 проц. аднаразовага збору.

Дагэтуль у м. Чарэі не абкладзены падаткам папы і рабіны.

Пры дакладзе на бюро райкому, загадчык райфа тав. Прыбышоў заявіў, што «рабін не абкладзены таму, што ён... божыца, што ён ня рабін», і наогул з-за адсутнасьці фінінспэктара, нельга праводзіць абкладаньня. Гэта даволі ясна характарызуе фінпасаўную работу ў Чарэі.

Паводка ў БССР

БАРЫСАЎ. (Наш кар.). Па горадзе затоплена 400 двароў. На Бярэзінскай ветцы затоплены склады, у якіх знаходзіліся авёс і соль. Але гэтыя тавары былі свалчасова падняты. Страт ніякіх няма. Працоўныя Барысава гераічна змагаюцца са стыхіяй. Актыўны ўдзел у барацьбе з паводкай прымаюць вайсковыя часьці.

У вёсны Мётча (Барысаўшчына) зьнесены млын. У мястэчку Чарняўка зусім зьнесла грэблю.

ВУЛА. (Наш кар.). Разьліў Дзьвіны нязвычайны. Большасьць мястэчка пакрыта вадой. Для барацьбы з паводкай мабілізавана ўсё пасельніцтва.

***

ЧАШНІКІ (наш кар.). У мястэчку нябывалая паводка. Вадой затапіла фабрыку «Чырвоная зорка». Сарвана запруда. Рабочыя гераічна змагаюцца з паводкай і працуюць круглыя сутки.

Супакойвацца яшчэ рана

Прайшоўшая зіма была нязвычайнай па колькасьці сьнегавых ападкаў. Сярэдні сьнегавы пласт быў таўшчынёю каля мэтра. У выніку мы мелі гэтымі днямі нябывалую паводку. Да наступленьня цёплых дзён стварыліся вялізарныя заторы, якія стрымлівалі цэлыя вазёры вады ў лагчынах. За два цёплыя дні заторы прарваліся і вада хлынула з усёй сілай.

Цяпер вада спала да ўзроўню нізкіх лугавых берагоў. Праз 3-5 дзён яна зьнізіцца яшчэ на мэтр. Але супакойвацца яшчэ рана. Сьнегу на палёх і ў лясох яшчэ вельмі многа. Яшчэ тыдзень цёплага надвор'я і рушыцца лясная вада. Зразумела, што такога ўзроўню, як 23-га красавіка, яна ўжо не дасягае, але ўсе даныя гавораць за тое, што вада можа падняцца да ўзроўню, а магчыма і вышэй леташняй асеньняй паводкі.

Гэта трэба добра мець на ўвазе, каб не аказацца непадрыхтаванымі.

А. Оршын.

Там, дзе сельсаветы патураюць кулаку

(Ад нашага карэспандэнта)

Ня гледзячы на шматлікія сыгналы друку і дырэктывы вышэйшых партыйных і савецкіх органаў, магілёўскія раённыя арганізацыі да гэтага часу не разгарнулі яшчэ ільназагатовак належнымі тэмпамі. На **20 красавіка плян па раёне выканан усяго на 40 проц.**

Яшчэ горш стаіць справа са спагнаньнем цьвёрдых заданьняў з кулацка-заможных гаспадарак. Кулакі рознымі мэтадамі імкнуцца ўнараваць ільназагатоўкі, ня выконваюць даных ім цьвёрдых заданьняў. Мясцовыя арганізацыі вельмі слаба змагаюцца з кулацкім сабатажам, ня прыцягваюць да судовай адказнасьці кулакоў—сабатажнікаў. У выніку—па 20 красавіка цьвёрдыя заданьні выкананы толькі на 36,6 проц.

У радзе сельсаветаў маюць месца простыя патураньні кулаку з боку кіруючых работнікаў. Старшыня **Слабодзкага** сельсавету на запытаньне, чаму так марудна спагняюцца цьвёрдыя заданьні з кулакоў, адказаў:

— **Бачыце, цьвёрдыя заданьні занадта вялікія і іх ніяк нельга выканаць.**

Гэтай думкі прытрымліваецца і сакратар сельсавету **Носікаў.** У выніку гэтых праваапартуністычных настрояў, ільназагатоўкі на сельсавеце фактычна сарываюцца. **Ні адна кулака-заможная гаспадарка да гэтага часу ня выканала цьвёрдага заданьня па здачы ільну.** Плян ільназагатовак выканан усяго на **40 проц.**

Такое-ж становішча і па **Новасельскім сельсавеце.** Тут плян загатовак ільну выкананы таксама на 40 проц. Большасьць кулацка-заможных гаспадарак дагэтуль яшчэ ня выканала цьвёрдых заданьняў. Сельсавет нічога ня робіць для спагнаньня ільназабавіна з кулакоў.

Трэба зараз-жа дабіцца карэннага аруху ў ходзе ільназагатовак па раёне. Магілёўскія раённыя арганізацыі, у першую чаргу загатоўчыя, павінны неадкладна перабудаваць сваю работу, прыняць усе меры да забясьпячэньня поўнага выкананьня пляну.

Выкарчаваць рэшткі сэктанцтва

У вёсны Шэпечы, Сухавецкага сельсавету, Маляўрскага раёну у 1930 г. арганізаваўся калгас. Ва кароткі тэрмін калгас паказаў узор арганізаванасьці. У калгасе ўжо адрамантаваны ўвесь інвэнтар, створан насенны фонд, падрыхтавана пятавая сіла.

На аснове пастаноў VI зьезду саветаў калгас пераўзяў усю сваю работу на здзельнічыну, вызначаную ў працадзнях.

У вёсцы існуе сэктанцкая група, якая імкнецца сарваць работу калгасу, не дацэнуць яго росту і гаспадарчага замацаваньня.

Каб дабіцца 100 проц. калектывізацыі вёскі Шэпечы, неабходна з карэньне выкарчаваць рэшткі сэктанцтва.

М.

Паведамленьні

СЕНЬНЯ:

— У пам. **ЦК КП(б)Б** (пак. 17) у 19 гадз.—нарада зат. адделаў вадзных наркаматаў і ўсіх цэнтральных установаў т. Менску па пытаньні аб перадовае працы па адделах кадраў. Явка ўсіх зат. адделаў кадраў—членаў КП(б)Б абавязкова.

— **Дом Асьветы.** У 19 гадз.—адкрыцьцё сход калектыву КП(б)Б прадасьветы. Парадак дня: Выніні пленуму ЦК КП(б)Б. Запрашаюцца асьветнікі г. Менску.

— **БДУ.** У 20 з пал. гадз., у пам. 204 корп. — адкрыты партыйна-камсамольскі сход калектыву Наргас.

— **Дом Камсьветы.** 26-IV у 19 гадз. пак. 19,—групавая кансультацыя для дакладчыкаў да першамайскіх сьвят.

Адказны рэдактар
С. БУДЗІНСКІ.

Беларускі Другі Дзяржаўны Тэатр І. Гурскі
27 красавіка адкрыты спэктакль **КАЧАГАРЫ** п'еса ў 4 дзеях.
Пачатак у 8 гадз. веч.

„Чырв. Зорка" Нач. 7. 8-45 і 10-30 — **СУД павінен працягвацца** Звыш праграмы гукавы фільм 13-ы КАСТРЫЧНІК.

„Культура" Новы фільм **ЯНТАНТ** (Бацькі і дзеці) Звыш праграмы—хроніка Белдзяржкіно. Пач. сэансаў 7. 8-45 і 10-30.

„Інтэрнацыянал" Замежны фільм **Апошнія навіны** Звыш праграмы—хроніка № 14 Саюзкіно. Пач. 1 с.—6 г. Каса—ад 4 г. 30 м.

„Пралетарый" **НАЧНЫ РАМІЗЬНІК** драма ў 6 частках. Пачатак 1 с.—6 г.

„Юны Піянэр" Цікавы фільм **ВАСЯ РЭФАРМАТАР** Пачатак з 1 г. дня. Каса—з 11 г.

„СПАРТАК", Нач. 7. 8-45 і 10-30 Каса—з 5 гадз. З панядзелка 27 красавіка Выдатны фільм **ЖЫВЫ ТРУП** паводле раману **Л. Толстога.** Драма ў 7 частках.

М. П. Р. Ю.
абвяшчае, што, у сувязі з хадайніцтвам раду калектываў, **тэрмін падпіскі на прамтавары і гародніну ПРАЦЯГНУТ да 1-га МАЯ.**
Да гэтага тэрміну падпіска павінна быць скончана.
Праўленьне.

АДКРЫТА ПАДПІСКА
на новую масавую часопісь ЦКК-РСІ
ЗА ТЭМПЫ, КАЧЕСТВО, ПРОВЕРКУ.
Адказны рэдактар **Ям. ЯРАСЛАЎСКІ.**
Часопісь зьяўляецца кіруючым органам ЦКК-РСІ, органам масавага пралетарскага кантролю.
Часопісь мабілізуе ўвагу мас на правэрцы выкананьня пастаноў партыі і ўраду, на палепшаньне работы ўсяго дзяржаўнага, гаспадарчага і каапэрацыйнага апарату.
Часопісь асобую ўвагу аддае прыцягненьню мас да кіраўніцтва дзяржавай і барацьбе з бюракратызмам.
Часопісь шырока асьвятляе работу ЦКК-РСІ, партколегіі ЦКК і вопыт мясцовых КК-РС.
№ 1. Выходзіць у бліжэйшыя дні № 1.
Часопісь выходзіць 2 разы ў месяц. Цана асобнага нумару 35 к. Падпісная цана да канца году (16 №№)—5 рублёў.
Падпіска прымаецца ва ўсіх пашчтовых аддзяленьнях і лістаносцамі і арганізатарамі падпіскі на прадпрыемствах.
Выдавецтва «Техника Управления» «Москва», центр., Ильинка, Рыбный пер., 2, пом. 28.

У плян дадатковых перавыбараў Гароавету Уносяцца наступныя зьмены:
Утрымаць рабочых і служачых фабрыкі „Беларуская" і астатніх члены саюзу Дрэвапрацоўшчыкаў, апрача утрымаўцаў заводу „Дрэвапрацоўшчык" абіраюць ке ў клюбе „Дрэвапрацоўшчык" 28-га красавіка ў 7 гадзін, а ў клюбе Зільоду ў 7 гадзін 28-га красавіка.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА — СЭКТАР КНІГАРАСПАЎСЮДЖВАНЬНЯ
ВЫШЛІ З ДРУКУ
с. ДЗЯЦІНА. —За перабудову партработы (прадмова тав. Гея). Цана 20 кап. Стар. 48. Тыраж 5.000.
п. ЛЫСАКОЎ. —Партработа ўцэху. Цана 20 кап. Стар. 44. Тыраж 5.000.
Продаж ва ўсіх кнігарнях Белдзяржвыдавецтва, спажыўкаапэрацыі і Саюздруку. 438

АД БЕЛКАНТОРЫ
ДЗЯРЖБАНКУ
1) Пачынаючы з 27 красавіка Белкантора і Менскае аддзяленьне Дзяржбанку будуць аплачваць рахункі, прад'яўленыя на кантэкарэнт платніка па аднагароднім зваротце толькі пасьля акцэпту рахунку і ў межах вольнага ліміту.
2) Усе арганізацыі павінны прадставіць у філіялы, дзе яны крадытуюцца, эксцлюзіўныя імі дагаворы, пачынаючы ад 100 тыс. рублёў, а ніжэй 100 тыс. руб. прадстаўляюць рэестры з пералічэньнем асноўных рэквізытаў дагавору.
3) Кантора папярэджвае, што арганізацыі, не прадставіўшыя дагаворы, бэлансаў і справаздачы, прадугледжаныя ВСНГ па выкананьні пляну, у тэрміны, раней апублікаваныя, крэдытам карыстацца ня будуць.
Для здачы **ВЕСТКІ** у газэту **„ЗЬВЯЗДА"** званоча па тэл. **7-81**
Кошт публікацыі 1 р. АБ ЗГУБЕ 1 дакументу

ВОПЫТНАЯ СТАНЦЫЯ НК РСІ (Савецкая, 55) 23 красавіка, у 6 з пал. гадз. веч.
— спэкцкае —
пашыраную народу рацыяналізатараў
цэнтральных і гарадзкіх саюзных, кааператыўных і грамадзкіх устаноў сумесна з эксперыментамі, прадстаўнікамі ад адміністрацый і ад шматлікіх груп установаў прадпрыемстваў на тэмы: **„Матэрыяльны пункт „Дзяржальня працы" ўстаноў".**

Ад Народнага Камісарыяту Фінансаў БССР
Для атрыманьня страхавой узнагароды працаўудзка ЖАКТ'ам і прыватным даваўласьнікам у тых гарадох БССР, дзе былі паводкі,
НЕ ПАЗЬНЕЙ 5-га МАЯ г. г.
заявіць рабочым фінансавым аддзелам, а ў гарадох Менску, Віцебску, Гомелі—гарфінаддзелам **пра понесьныя страты ад паводкі:** Ж КТ'амі—ад пашкоджаньня будынкаў і іншых матар'яльных каштоўнасьцей, а—даваўласьнікамі—ад пашкоджаньня **толькі будынкаў.**
Наркамфін БССР.

Стара-Барысаўскі сьвінагадоўчы тэхнікум абвяшчае, што
ПРЫЁМ ЗАЯЎ НА ПЕРШЫ КУРС ПРАЦЯГНУТ да 5 мая.
Прымаюцца асобы ад 15 да 25 год. Асобы, скончыўшыя поўны курс працоўнай школы 2-й ступені і 2-хгадовыя агульна-адукацыйныя курсы, сямігодовай працоўнай школы, школы для дарослых павышанага тыпу, ШКМ, с.-г. прафшколы і курсы па падрыхтоўцы ў тэхнікумы, пры паступленьні ў тэхнікум прымаюцца без іспытаў.
Да заявы прыкладаюцца наступныя дакументы: 1) анкета па форме устаноўленай для паступаючых у тэхнікум, заверанай прафсэкцыянымі або сярэдкімі арганізацыямі; 2) аб узросьце (мэтрыка); 3) аб адносінах да вайсковай павінасьці (для мужчын); 4) аб асьвеце; 5) аб стане здароўя; 6) аб сацыяльным і матар'яльным становішчы паступаючага і яго бацькоў, для калгасьнікаў—даведка аб уступленьні ў калгас; для сялян—даведка сельсавету аб аплаце с.-г. падатку; 7) дзьве фатаграфічныя карткі.
Прынятыя будуць забясьпечаны стыпэндыяй, згодна пастановы ўраду ад 16-IX—30 г.
Заявы і дакументы накіроўваць па адрасе—**г. Барысаў, Стара-Барысаўскі Сьвінагадоўчы Тэхнікум.**
Дырэктар тэхнікуму **Жукаў.**

1-шы МАСКОЎСКІ
Авіяцыйны Тэхнікум ВОГВФ
абвяшчае **ВЕСНАВЫ ПРЫЁМ**
на аддзяленьні:
а) **борт-механікаў,**
б) **тэхнікаў станцыйных,**
в) **тэхнікаў майстэрань па рамонце самалётаў і матораў.**
УМОВЫ ПРЫЁМУ:
У тэхнікум прымаюцца асобы абодвых родаў ва ўзросьце ад 17 да 27 год. Асьвета ў аб'ёме ня ніжэй школы 5-годкі. Добрае фізічнае разьвіцьцё, здаровае сэрца і лёгкія і добры зрок, рост у межах 157—185 см.
Прыём праводзіцца па камандмроўках ад партыйных, камсамольскіх, прафсыянальных арганізацый, Асоавіяхіму і іншых грамадзкіх арганізацый.
Акрамя камандмроўк, да заявы аб паступленьні неабходна прыкладаць даведку аб асьвеце, аб рабочым стажы, аб узросьце, аб сацыяльным становішчы, аб адносінах да вайсковай службы і даведку аб стане здароўя, даведку аб непадсуднасьці.
Тэхнікум галоўным чынам камплектуецца з Маскоўскай і Заходняй абласьцей і Беларускай ССР, але могуць паступаць і з іншых месц Савецкага Саюзу.
Паступаючыя падлягаюць іспытам па наступных прадметах: па расійскай мове, матэматыцы, фізыцы (папярэдняя вестка), кароткія весткі з механікі, кароткія весткі з аддзелаў—вадкасьці, газаў і цяплыні), кароткія весткі па самалётах і маторах. Знаёмства са сьлясарнай, сталярнай і такарнай вытворчасьцю (знаёмства з адной з паказаных вытворчасьцей).
Гісобы, скончыўшыя 7 і 9-годку, ад іспытаў па агульнаасьветных прадметах вызваляюцца.
Мандатная камісія працуе з 3-га па 20 мая.
Паступаючыя павінны асабіста зьявіцца ў мандатную камісію. Мандатная камісія працуе з 9 да 15 гадз. па адрасе: **„Масква, 1-я Тверская-Ямская ул., д. № 32".**
Па паказаным адрасе накіроўваць усе заявы.
Тэрмін падрыхтоўкі ў тэхнікуме—паўтарагадовы, прынятыя залічваюцца на стыпэндыю.
Пры ўдачы дакумэнтаў трэба прыкладаць 2 фотакарткі і на 30 кап. пашт. марак.
Дырэктар тэхнікуму **Пятроў.**

Менскія дзяржаўны архітэктурна-будаўнічы, дарожна-будаўнічы і вячэрні рабочы тэхнікумы
прымаюць заявы на падрыхтоўчыя курсы ў гэтыя тэхнікумы
ДА 1-ГА МАЯ 1931 году.
427

ЗБІРАЙЦЕ ЛЕКАВЫЯ ТРАВЫ!
Калгасьнікі, аднаасобнікі—беднякі і серадняк, вучні школ і піянэр-атрады! Арганізуйце брыгады па зборы лекавых траў. Не давайце гінуць на палёх сотням тысяч руб.!
ЗБОР ЛЕКАВЫХ ТРАЎ—
ДОБРЫ ЗАРАБОТАК
У гэтым годзе лекавыя расьліны будуць прымацца наступнымі заготаўшчыкамі:
Белкаапсаюз праз сваю сетку спажывецкіх т-ваў;
Белаптэкакіраўніцтва праз свае аптэкі;
Белсадсаюз праз сваю сетку;
Белсаюз палучных праз сваю сетку.
Сьвіс лекарству, надзагатоўнага заготаўцы ў бягучым годзе
зеравы корань аныўчаны, зеравы корань незчышчаны, бялёна—ліст, бярозавыя пупышкі, бадзяга, брусьніца—лісьце, валяр'янавыя карэньні, томка (баркун), дубровнік—корань, дурнап'ян—лісьце, цьвінтарэй звычайны, пазёмка, браткі, дзяцелепнік—чырвоны дзікі, кара крушыны, канаэлія—лісьце, дзерава плывушка, жіпавы цьвет, ягады ядлоўцу, яйкі мурашак, мухавец—корань, папараць—корань, рабіна сухая, сон звычайны, сасновыя пупышкі, ракіжі, мучанічнік, трыфоль, кмень насенньне, чарніцы, вяўкі, чабор.
Лекарэц павінен здавацца ў сухім відзе, без пяску і без іншых прымешак.
Здатныя лексырцу будуць часткова прэміявацца прамтаварамі.
За інструкцыямі па зборы лексырцу трэба зварачацца ў бліжэйшы загатоўчы пункт.
Зараз надыходзіць веснавы сезон збору сасновых пупышкі, каронкі, бярозавых пупышкаў і кары крушыны.
263 **Усесаюзнае аб'яднаньне «Лентехсыр'ё».**

З 22 красавіка г. г. МЦРК пачынае
ВЫДАЧУ НОВЫХ НАБОРНЫХ КАРТАК
пайшчыкам і наладчыкам па наступных пунктах:
1-е аддзяленьне міліцыі:
Ленінская д.—8 Райбюро № 1.
2-е аддзяленьне міліцыі:
1-шы пункт Крапоткіна вул., 16—Нардом.
2-гі „ Рог Шырокай і Н.-Камароўскай—крамах МЦРК, 38
3-ці „ Камунальн., 31—был. памяшк. Райбюро, 3.
4-ты „ Рог Савецкай і Камароўскай—крама 11.
5-ты „ Першамайская, 3—крама 138.
6-ты „ Дзяржабродзкая, 48—крама 56.
3-е аддзяленьне міліцыі:
1-шы пункт: Клюб імя Леніна—пасажырская станцыя
2-гі „ Серабранка, 10—